## Адносіны Беларусі і Эстоніі павінны атрымаць новы імпульс для далейшага развіцця

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Эстонскай Рэспублікі Тоомаса Хендрыка Ільвеса і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём Незалежнасці. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што Беларусь і Эстонія маюць значны патэнцыял для паспяховага пашырэння сувязяў ва ўсіх сферах супрацоўніцтва. «Спадзяюся, што ў бліжэйшай перспектыве адносіны паміж нашымі краінамі, заснаваныя на павазе і ўзаемаразуменні, атрымаюць новы імпульс для развіцця на карысць беларускага і эстонскага народаў», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

## ЦІ МОЖА БЫЦЬ ВОДПУСК З... ТРОХ ЧАСТАК?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Арганізацыя, з якой звольнілася жанчына, аплаціць лісток часовай непрацаздольнасці абавязкова, і прычым — аплаціць не адзін дзень, а ўсю працягласць «бальнічнага», — адзначае Ірына Шыляева. — Калі ж гэтага не адбылося, можна звярнуцца па дапамогу — скажам, у дзяржінспекцыю працы.

**ДЗІЦЯ-ІНВАЛІД ДАЕ ПЕРАВАГІ**

*Скарачэнне — рэч непрыемная, і патрапіць пад яго можа ці не кожны. І ўсё ж наколькі стасуецца з заканадаўствам звальненне жанчыны, якая мае няпоўнагадовага дзіця-інваліда?*

— Скарачэнне падпадае вельмі спрэчным, прынамсі, артыкул 268 Працоўнага кодэкса вызначае: скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка з жанчынамі, якія маюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, магчыма толькі ў выпадку ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка або нейкіх «вінаватых» учынкаў самой работніцы, — падкрэслівае **намеснік начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння дэпартамента дзяржінспекцыі працы Вадзім БРАТАШ**. — Словам, падобная сітуацыя — падстава для звароту ў суд. Аднак трэба мець на ўвазе: звярнуцца ў суд неабходна не пазней чым праз месяц пасля звальнення.

**СТАЖ НЕ ЛІЧАЦЬ ДВОЙЧЫ**

*Традыцыйна складаная тэма — пенсіі. Як вядома, значная частка школьнікаў у вольны ад навучання час працуе ў сельгаспадпрыемствах. Наколькі магчыма залічыць такую працу ў стаж?*

— Залічэнне перыядаў працы школьнікаў у стаж магчыма, аднак паколькі ў члены калгаса, як правіла, прымаліся толькі асобы з 16-гадовага ўзросту, такі залік робіцца па фактычнай працягласці — па формуле «дзень за дзень», — заўважае **галоўны спецыяліст упраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля АРНАЎТ**. — Аднак у гэтай сітуацыі перш-наперш неабходна пацвердзіць саму работу, а гэта атрымліваецца не заўсёды. Скажам, залік не будзе зроблены ў выпадку, калі ў гаспадарцы захаваліся ўсе неабходныя дакументы, але ў дакументах адсутнічаюць звесткі аб падлетках — хутчэй за ўсё, перыяды іх працоўнай дзейнасці ў вольны ад навучання час проста «запісваліся» на маці або бацьку і пайшлі ў іх стаж.

**КАЛІ НЕЛЬГА, АЛЕ ТРЭБА**

*Маці і сын-інвалід І групы жывуць разам, яе працоўная пенсія складае 585 тысяч, яго пенсія па інваліднасці — 217 тысяч рублёў. З улікам усіх выдаткаў агульны даход атрымліваецца, мякка кажучы, невялікім. І тым не менш ён перавышае «планку», што дае права на штомесячную або аднаразовую адрасную сацыяльную дапамогу. Ці ёсць тут выйсце?*

— Калі сям'я апынулася ў па-сапраўднаму няпростым становішчы, але яе даходы не дазваляюць атрымліваць адрасную сацыяльную дапамогу, у якасці аднаго з варыянтаў можна параіць звярнуцца па дапамогу са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва — такая дапамога можа аказвацца адзін раз на працягу года, — зазначае **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага райвыканкама Таісія БАРОЎСКАЯ**. — Плюс да таго, ёсць яшчэ адзін шлях — зварот па матэрыяльную дапамогу ў райвыканкам, праўда нялішне заўважыць: аказанне такой падтрымкі будзе залежаць ад магчымасцяў кожнага канкрэтнага рэгіёна.

## ОАО «БЕЛТОРГСТРОЙ»

**сообщает, что 30 марта 2010 года в 14.00 состоится общее собрание акционеров по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31. Регистрация — с 13.00. При себе иметь паспорт.**

**Повестка дня:**

- Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и основных направлениях развития на 2010 год.
- Отчет о работе Наблюдательного совета.
- Отчет Ревизионной комиссии.
- Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса за 2009 год.
- О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2009 год.
- Направления использования чистой прибыли на 2010 год.
- Выборы членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
- Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
- О передаче полномочий общего собрания по вопросам подпунктов 27.13—27.17 пункта 28 главы 6 Устава в компетенцию Наблюдательного совета сроком на один год.
- О требованиях к регламенту работы акционерного общества с реестром владельцев ценных бумаг.

УНП 100633428

## ОАО «МОЛОДЕЧНОЛЕС»

**сообщает, что 25.03.2010 года в 11.00 по адресу: г. Вилейка, ул. 1-ого Мая, 106 состоится общее годовое собрание акционеров ОАО «Молодечнолес»**

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и определение основных направлений деятельности Общества в 2010 году.
2. О результатах налоговой проверки ОАО «Молодечнолес».
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.
4. Распределение прибыли (покрытие убытков) Общества за 2009 год. О выплате дивидендов за 2009 год.
5. О направлениях использования прибыли Общества в 2010 году.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. О вознаграждении членов Наблюдательного совета ОАО «Молодечнолес» и Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.
8. Об открытии филиала на базе Ивенецкого лесопункта.
9. Об увеличении уставного фонда за счет выпуска доп. акций.
10. О внесении изменений в устав Общества.
11. Утверждение регламента работы с реестром владельцев ценных бумаг.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Вилейка, ул. 1-го Мая, 106 с 20 по 25 марта (с 9.00 до 16.30) либо 25 марта с 9.30 до 10.00.

Начало работы собрания — 25 марта 2010 года в 11.00.

Регистрация участников с 9.00 до 11.00 по предъявлению документа, подтверждающего личность, а представителю акционера и доверенность.

Список акционеров Общества составлен по данным реестра акционеров на 1 марта 2010 года.

**Тел. для справок 8 (01771) 3 52 32.**

УНП 600066488 Наблюдательный совет ОАО «Молодечнолес».

Рэгіён

# ПРА СУПЕРКАМП'ЮТАР, «ЗАПРОШАНАГА ПРАФЕСАРА» І СТУДЭНЦКІЯ ІНТЭРНАТЫ

карэспандэнту «Звязды» расказаў рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Яўген РОЎБА

**70-гадовы юбілей найбуйнейшай рэгіянальнай ВНУ краіны яго 26-тысячны калектыў адзначае не толькі навуковымі канферэнцыямі, але і фестывалем студэнцкіх відэапраектаў, Купалаўскімі чытаннямі, выставай жывапісу ў сваёй галерэі «Універсум», вечарам джазавай музыкі, «Юбілейнай бітвай» паміж камандамі КВЗ з Гродна і сталіцы і іншымі імпрэзамі.**

**— У чым жа спецыфіка і задачы менавіта рэгіянальнай ВНУ? — цікаўлюся ў рэктара.**

— Звярніце ўвагу на такія лічбы. Сёння ў рэгіёнах працуе 80 працэнтаў эканамічна актыўнага насельніцтва і ствараецца 75 працэнтаў ад усяго аб'ёму прамысловай прадукцыі. А разам з тым, у рэгіёнах працуюць толькі 24 працэнты навуковых работнікаў. Зразумела, што ВНУ павінны быць і пунктамі інавацыйнай інфраструктуры. Асабліва рэгіянальныя, паколькі гродзенскаму прадпрыемству значна лягчэй узаемадзейнічаць з універсітэтам, які побач.

Універсітэт імкнецца быць у адной «звязцы» і ў нейкай меры пасрэднікам паміж прадпрыемствамі нашага рэгіёна і Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. Акадэмія нам у гэтым плане вельмі дапамагла, прыняўшы рашэнне паставіць у ГрДУ адзін з двух суперкамп'ютараў. Цяпер у нас ёсць значны патэнцыял, які дазволіць на сучаснай аснове супрацоўнічаць з прадпрыемствамі і ўстановамі Гродзеншчыны.

**— Сын маіх сваякоў заканчвае «бюджэтную» вучобу ў адной са сталічных ВНУ і летась па яго спецыяльнасці там... не было дзяржаўнага размеркавання. А вось знаёмы з Германіі расказваў іншае. Калі перад ягоным сынам пасля атрымання сярэдняй адукацыі паўстала пытанне аб далейшай вучобе, то маладога чалавека папярэдзілі, што выбраная ім спецыяльнасць праз пэўны час можа быць незапатрабаванай на рынку працы... Як ацэньваеце гэту праблему? Ці прасочваеце, як складваецца працоўны шлях выпускнікоў універсітэта?**

— Сёння мы стараемся аператыўна рэагаваць на патрэбы эканомікі перш за ўсё рэгіёна. Адсюль і новыя спецыяльнасці апошняга часу, напрыклад, у сферы будаўніцтва, турызму і сэрвісу, дызайну. Сёлета і ў найбліжэйшай перспектыве плануем адкрыць падрыхтоўку спецыялістаў па арганізацыі грамадскага харчавання і транспартных перавозак, па камп'ютарнай бяспецы, інфармацыі і камунікацыях, экспертызе і кіраванні нерухомасцю і іншых. Тэндэнцыя цяпер такая, што набор на юрыдычныя, эканамічныя і некаторыя педагагічныя спецыяльнасці скарачаецца, а вось на тэхнічныя — павялічваецца.

Згодна з сённяшнім заканадаўствам, выпускнікі-«бюджэтнікі» абавязаныя адпрацаваць па размеркаванні два гады. Пры гэтым наша электронная база «Выпускнік» утрымлівае ўсе неабходныя звесткі для сувязі з выпускнікамі і наймальнікамі. Атрымліваем поўную інфармацыю аб перамяшчэнні маладога спецыяліста па службе, аб пераводзе да іншага наймальніка, звальненні. Дарэчы, памяняць месца працы ён можа толькі пасля пераразмеркавання ва ўніверсітэце.

Такім чынам, у ВНУ ёсць усе магчымасці для таго, каб прасачыць далейшы працоўны шлях сваіх выхаванцаў. І мы павінны не толькі атрымліваць гэту інфармацыю, але і рабіць больш высноў для сябе, для арганізацыі навучальнага працэсу.

**— Якія новыя адукацыйныя тэхналогіі цяпер прымяняюцца?**

— Вядучым кірункам, безумоўна, з'яўляецца інфарматызацыя. Стварылі электронную бібліятэку, практыкуем электронныя прэзентацыі пры чытанні лекцый. Толькі летась набылі каля 400 камп'ютараў і мультымедыйных праектараў. А для студэнтаў-завочнікаў прымяняем тэхналогіі дыстанцыйнага навучання. Напрыклад, з кафедры тэарэтычнай фізікі кожны студэнт замест традыцыйных кантрольных працаў атрымлівае праз інтэрнэт заданне па навучальнай дысцыпліне разам з методыкай, сістэмай кантролю правільнасці яго выканання і тэарэтычным матэрыялам.



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Дарэчы, студэнты завочнай формы навучання таксама праз інтэрнэт могуць кантактаваць з выкладчыкамі. Але нават у сучасных умовах, пры ўсёй значнасці інфармацыйных тэхналогій нішто не заменіць сустрэчаў, як кажуць, вочы ў вочы. Пры гэтым з мінулага года ва ўніверсітэце рэалізуецца праграма «Запрошаны прафесар», калі чытаюць лекцыі і праводзяць «круглыя сталы» вядомыя навукоўцы як нашай краіны, так і замежжа.

Практыкуем і навучанне нашых студэнтаў на працягу семестра ў... іншых беларускіх і замежных ВНУ. Цяпер, напрыклад, два студэнты факультэта матэматыкі і інфарматыкі назапашваюць веды ў Белдзяржуніверсітэце, а два студэнты факультэта турызму і сэрвісу — у Польшчы.

Найбольш актыўна мы супрацоўнічаем з універсітэтамі Польшчы, Расіі, Літвы, Украіны, Германіі. У ГрДУ дзейнічаюць цэнтры кітайскай і нямецкай мовы і культуры, а ў найбліжэйшы час з дапамогай Парка высокіх тэхналогій будзе створаны беларуска-індыйскі цэнтр дыстанцыйнага навучання.

**— Як студэнты-«купалаўцы» забяспечаны месцамі ў інтэрнатах?**

— Сёння — на 76 працэнтаў. Але за кошт чаго? «Ушчыльнілі» пакоі, і там, дзе жылі тры чалавекі, — цяпер чатыры. Калі б гэтага не адбылося, то забяспечанасць месцамі ў інтэрнатах была б ніжэйшай за 50 працэнтаў. Таму трэба будаваць інтэрнаты, мяркую, варта распрацаваць адпаведную абласную праграму для шэрагу навучальных устаноў. Гэта вельмі важна не толькі для беларускіх студэнтаў, але і для павелічэння экспарту адукацыйных паслуг, які сёння тармозіцца менавіта з- за гэтай праблемы.

**— Яўген Аляксеевіч, якія задачы ставіце перад сабой на найбліжэйшы перыяд?**

— Першая задача: мы павінны вельмі моцна развіваць кадравы патэнцыял, узмацняць падрыхтоўку маладых выкладчыкаў праз аспірантуру сваю, вядучых ВНУ як Беларусі, так і Расіі. Гэта самае галоўнае, што вызначае якасць навучальнага працэсу.

І другое. Так здарылася, што для ГрДУ за яго 70-гадовую гісторыю не было пабудавана ніводнага будынка. Хоць за апошнія гады і ўведзена восем карпусоў, вучэбныя плошчы падвоеныя, але заўсёды нешта перабудоўвалі. А ўніверсітэту патрэбны сапраўдны галоўны корпус — новы, сучасны. Зямельны ўчастак для будаўніцтва вучэбнага корпуса, а таксама іншых будынкаў для бібліятэкі, інтэрната, спартыўнага комплексу нам ужо выдзелены. Гэта задача ўнесена ў рэспубліканскі праект развіцця вышэйшай школы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Гродзенскаму дзяржуніверсітэту імя Янкі Купалы прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Беларусі

За асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці, падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў і ў сувязі з 70-годдзем з дня заснавання Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Янкі Купалы прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі падпісаў 24 лютага.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЕЎРАСАЮЗЕ ЗАКЛІКАЮЦЬ СЕРБІЮ ЗМІРЫЦЦА СА СТРАТАЙ КОСАВА



**Сербіі варта змірыцца са стратай Косава, лічаць у Еўрасаюзе. Такі пункт гледжання паслы дзвюх найбуйнейшых краін ЕС — Францыі і Германіі — выказалі ў інтэрв'ю бялградскім газетам.**

Дыпламаты, у прыватнасці, адзначылі, што населенае пераважна албанцамі Косава ніколі не вернецца ў сферу ўплыву Сербіі. Таму Бялграду варта ўсталяваць добрасуседскія адносіны з Прышцінай, перадае Deutsche Welle. Гэта з'яўляецца адной з галоўных умоў для наступнага збліжэння паміж Сербіяй і Еўрасаюзам, падкрэслілі паслы.

Як адзначае агенцтва dpa, раней улады Белграда зыходзілі з таго, што іх краіна можа стаць членам ЕС, але і пасля гэтага імкнуцца да вяртання Косава ў склад Сербіі. У прыватнасці, у Міжнародны суд быў пададзены іск з патрабаваннем асудзіць прызнанне незалежнасці Косава большасцю краін ЕС, а таксама ЗША, Японіяй і іншымі дзяржавамі.

Такім чынам Белград спрабуе давесці, што прызнанне з'яўляецца парушэннем нормаў міжнароднага права. У рамках ААН Сербія мае намер дамагчыся аднаўлення перамоваў паміж Белградам і Прышцінай аб статуце Косава.

### ПУЦІН ВЫРАШЫЎ БУДАВАЦЬ АЭС У КАЛІНІНГРАДСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін падпісаў распараджэнне аб будаўніцтве ў Калінінградскай вобласці Балтыйскай атамнай станцыі, якая можа стаць першым у краіне праектам АЭС з удзелам прыватнага, у тым ліку замежнага, капіталу.**

У сераду сайт урада паведаміў, што Балтыйская АЭС размесціцца ў Нёманскім раёне Калінінградскай вобласці. Прапанова «Расатама» аб яе будаўніцтве ўзгоднена з Мінпрыроды і іншымі зацікаўленымі ведамствамі, гаворыцца ў дакуменце, размешчаным на сайце ўрада.

### АБ КАТАВАННЯХ У ЦРУ ВЕДАЛІ 68 ЧЛЕНАЎ КАНГРЭСА

**Прынамсі 68 федэральных заканадаўцаў ЗША ў перыяд з 2001 па 2007 год атрымалі справаздачы аб «катавальнай» праграме ЦРУ. Як перадае агенцтва Reuters, інфармацыя аб гэтым утрымліваецца ў рассакрэчаных па патрабаванні праваабаронцаў матэрыялах ведамства. У 2009-м, пасля змены ў ЗША прэзідэнцкай адміністрацыі, жорсткія метады працы разведкі сталі прадметам палітычных спрэчак.**

Як раней стала вядома, з санкцыі ўрадавых юрыстаў ЦРУ выкарыстоўвала да падазроных у тэрарызме комплекс метадаў інтэнсіўнага допыту: у прыватнасці, актыўна выкарыстоўвалася так званае «частковае ўтапленне» або катаванне вадой. Звесткі аб гэтым паслужылі падставай для крытыкі дэмакратаў у адрас рэспубліканскай адміністрацыі Джорджа Буша-малодшага, але затым высветлілася, што аб жорсткіх допытах ведалі і палітыкі-дэмакраты, у тым ліку цяперашні спікер Палаты прадстаўнікоў, былы парламенцкі арганізатар дэмакратаў Нэнсі Пілозі.

### АЎСТРАЛІЯ ЎВЯДЗЕ БІЯМЕТРЫЧНЫЯ ВІЗЫ ДЛЯ ГРАМАДЗЯН «РЫЗЫКОЎНЫХ» КРАІН

**Урад Аўстраліі зробіць больш жорсткімі правілы выдачы візаў для грамадзян дзесяці дзяржаў, якія лічацца «рызыкоўнымі» з пункту гледжання распаўсюджвання тэрарызму і экстрэмізму, паведамляе The New Zealand Herald.**

Аб хуткіх уводзінах у дзеянне новага парадку паведаміў прэм'ер-міністр краіны Кевін Рад. Пры гэтым, якія краіны патрапілі ў «чорны спіс», ён не ўдакладніў. Для атрымання візы грамадзянам гэтых дзяржаў у абавязковым парадку давядзецца падаць адбіткі пальцаў і біяметрычныя звесткі аб пабудове твару.



Раней аўстралійскія ўлады ўжо зрабілі больш жорсткай іміграцыйную палітыку. У прыватнасці, радыкальна быў перагледжаны і скарочаны спіс спецыяльнасцяў, у якіх эканоміка Аўстраліі мае патрэбу.

## Спробы націску на Беларусь па сітуацыі з Саюзам палякаў контрпрадукцыйныя

**Любыя спробы звонку аказаць уплыў на сітуацыю з Саюзам палякаў у Беларусі або спробы прымусіць беларускія ўлады падтрымаць які-небудзь з бакоў не толькі не прымальныя, але і контрпрадукцыйныя. Аб гэтым гаворыцца ў адкрытым пісьме да еўрапейскіх СМІ <u>пасла Беларусі пры еўрапейскіх структурах у Бруселі Уладзіміра СЯНЬКО.</u>**

«Адсутнасць тэрытарыяльных, рэлігійных і этнічных канфліктаў — адно з галоўных дасягненняў беларускай незалежнай дзяржавы. Захаванне правоў і свабодаў усіх этнічных груп, усебаковая падтрымка іх грамадскай дзейнасці застаецца ключавым элементам унутранай палітыкі дзяржавы, на які выдзяляюцца істотныя бюджэтныя сродкі», — адзначаецца ў заяве.

Уладзімір Сянько падкрэслівае, што ўласнасць польскіх грамадскіх арганізацый застанецца ў руках беларускіх грамадзян з польскімі каранямі. «Мы былі здзіўлены, калі даведаліся, што польскія прадстаўнікі накіравалі гэта пытанне на разгляд у Брусель. Рэакцыя чыноўнікаў еўраструктур яўна несуразмерная сутнасці праблемы. У асобных заявах разам з абвінавачаннямі ў адрас Беларусі гучалі таксама пагрозы ўвядзення палітычных і эканамічных санкцый», — гаворыцца ў адкрытым пісьме.

Дыпламат выказаў сур'ёзную заклапочанасць «прадузятай рэакцыяй польскіх СМІ і асобных афіцыйных структур меўшай месца скажонай інтэрпрэтацыі рэальнага становішча польскай нацыянальнай меншасці». Паводле яго слоў, яны не ўлічваюць меркаванне абсалютнай большасці грамадскіх арганізацый. Пасол падкрэсліў, што пазіцыя беларускіх уладаў застаецца нязменнай: праблемы з СПБ могуць быць вырашаны толькі ўнутры самой арганізацыі і ў адпаведнасці з беларускімі законамі.

**БЕЛТА.**

## АДПОМСЦІЎ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**37-гадовы мінчанін размясціў у «павуціне» несапраўдную інфармацыю пра жанчыну, якая адмовілася ад сустрэчы з ім.**

Паводле звестак **прэс-афіцэра Кастрычніцкага РУУС Сяргея ЧАБАТАРОВА,** па дапамогу да праваахоўнікаў прыйшла 27-гадовая жанчына, чый гонар абразіў невядомы, які выклаў на сайт для знаёмстваў, што выкарыстоўваецца для інтымных знаёмстваў за грошы з дзяўчатамі лёгкіх паводзінаў, кантактны тэлефон пацярпелай. Знайшліся «заклапочаныя», якія пачалі турбаваць жанчыну, якая, між іншым, замужам і знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці. У Кастрычніцкім РАУС завялі крымінальную справу па частцы 2 артыкула 188 КК — «паклёп». Несапраўдныя звесткі ў інтэрнэце размясціў 37-гадовы мінчанін, з якім заяўніца мела стасункі праз сетку. У ходзе перапіскі незнаёмка настолькі зацікавіла зламысніка, што ён прызначыў ёй сустрэчу, на якую, аднак, тая не адгукнулася. Тады пакрыўджаны мужчына напісаў ёй, што «за такія жарты цябе хто-небудзь правучыць і будзеш плакаць». Толькі апошняе наканавана было менавіта яму: падобныя «жарты» караюцца — да 6 месяцаў арышту. Разам з тым, у ходзе разбору пацярпелая і яе крыўдзіцель знайшлі кампраміс: мужчына кампенсаваў маральную шкоду, а жанчына пагадзілася забраць заяву. Крымінальная справа па прымірэнні бакоў закрытая.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ВАРТАЎНІК І ЗЛОДЗЕЙ У АДНОЙ АСОБЕ

Вартаўнік аднаго з СВК Мсціслаўскага раёна скраў амаль тону камбікорму. Жыхар вёскі Несцерава, якому 28 гадоў, заўважыў, што ў варотах на складзе ёсць добрая шчыліна. Таму збіваць замок не давялося: дзве вартаўнічыя змены праз шчыліну ён спакойна выносіў камбікорм і грузіў на санкі. Сума скрадзенага перавысіла 600 тысяч рублёў.

**Алена КАЗЛОВА.**

СЧИТАТЬ НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНЫМИ СТРАХОВЫЕ ПОЛИСЫ
ЗАО «СК БЕЛРОССТРАХ»

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ № 0757455, 0762222, 0788919, 0788924—0788925, 0788929, 0789895, 0823921—0823923, 0823925—0823928, 0830703—0830705, 0832715, 0848036, 0877290, 0877298—0877299.

**Наблюдательный совет ОАО «БЕЛЭНЕРГОАВТОМАТИКА» сообщает о проведении 31 марта 2010 года в 14.00 общего собрания акционеров по итогам работы за 2009 год по адресу: г. Минск, ул. Омельянюка, 20, второй этаж, зал заседаний**

**Повестка дня:**

1. Отчет о работе Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии в 2009 году.
2. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества в 2010 году.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков и распределение прибыли за 2009 год, с учетом заключения Ревизионной комиссии.
4. О направлении использования чистой прибыли Общества в 2010 году и первом квартале 2011 года.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

С материалами можно ознакомиться по месту нахождения Общества в рабочие дни **с 22 по 30 марта 2010 года с 8.00 до 16.00.**

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 14.00** по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 11 марта 2010 г.**

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:** акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 100064414

## ЗДАБЫЧА РАБАЎНІКОЎ — 10 ТЫСЯЧ І БУТЭЛЬКА КАНЬЯКУ

**У вёсцы Цяхцін Бялыніцкага раёна 25-гадовы мужчына, які нідзе не працуе, надвячоркам 22 лютага адабраў у 21-гадовага аднавяскоўца грошы. Рабаўніцтва было адкрытым і з ужываннем гвалту, а здабыча склала 10 тысяч рублёў.**

У Глуску познім вечарам таго ж дня на вуліцы Савецкай 25-гадовы жыхар вёскі Хвастовічы адабраў у 37-гадовага жыхара райцэнтра бутэльку каньяку. Нягледзячы на мізэрнасць здабычы у першым і другім выпадках, рабаўнікі затрыманы і ў дачыненні да іх расследуюцца крымінальныя справы.

**Алена КАЗЛОВА.**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- ❖ **Оценка оборудования и транспортных средств**
- ❖ **Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности**

**Извещает о проведении аукциона по продаже недвижимости ОАО НТК «Алеся» 30 марта 2010 г.**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (помещение магазина) | г. Гомель, проспект Ленина, 31 | Площадь изолированного помещения – 198,6 м$^2$ Помещение находится в кирпичном жилом доме. В стоимость лота входит также сигнализация, тротуарная дорожка. Площадь земельного участка – 0,1676 га | 706 303 000 | 7 000 000 |
| **Срок подачи заявления** | | | **До 17.00 29 марта 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а | | |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | | | **30 марта 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» НПРУП «Жилкоммунтехника» | | |
| **Номер р/с для перечисления залога** | | | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509 | | |
| **Условие продажи** | | | Без условий. Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов –10 %, вознаграждение – 4 % | | |
| **Условие пользования** | | | Объекты продаются в собственность | | |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).**

## Абзац

◢ **У мінулым годзе ў Беларусі на 100 нованароджаных дзяўчынак прыходзілася 107 немаўлят мужчынскага полу. Аналагічная сітуацыя захоўваецца ў краіне на працягу многіх гадоў. Як сцвярджаюць статыстыкі, такая і сусветная дэмаграфічная тэндэнцыя — хлопчыкаў нараджаецца больш, чым дзяўчынак.**

◢ Каля 40 жыхароў Беларусі ўтапіліся летась у ваннах. Па звестках таварыства выратавання на вадзе, летась у Беларусі 627 чалавек патанулі ў натуральных вадаёмах, больш за 340 — пры купанні. Падчас рыбнай лоўлі загінулі 119 чалавек. Пры прыняцці ванны патанулі каля 40 чалавек, пры катанні на плаўсродках — 20, пры пераходах і гульнях на лёдзе — 25 чалавек. 14 чалавек ажыццявілі суіцыды на вадзе.

◢ **У Брэсце глыбай лёду, што звалілася з даху, сур'ёзна траўмаваная 10-месячная дзяўчынка. Яна знаходзіцца ў рэанімацыі дзіцячай абласной бальніцы. У яе закрытая чэрапна-мазгавая траўма, страсенне галаўнога мозга, пералом лобнай косткі, траўмы пляча і перадплечча. Праводзіцца разбор.**

◢ Урач у Салігорскім раёне выдаваў фіктыўныя бальнічныя за грошы і спіртное. Педыятр дзіцячай кансультацыі Старобінскай паліклінікі прызнаны вінаватым у сістэматычным атрыманні хабару ў выглядзе грошай, спіртовых напояў і прадуктаў харчавання за выдачу фіктыўных лістоў па доглядзе хворых дзяцей асобам, якія не мелі на гэта права. Сумы хабару складалі ад Br50 тыс. да Br200 тыс. Урач асуджаны на 4 гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму.

◢ **У Гомелі затрымалі групу з чатырох чалавек, якія спецыялізаваліся на крадзяжы літых дыскаў з аўтамабіляў у дварах жылых мікрараёнаў. Маладыя людзі ва ўзросце 20—24 гадоў дзейнічалі ў «супрацоўніцтве» з некалькімі гарадскімі таксістамі. Ім збывалася крадзенае. Іншы раз крадзяжы ажыццяўляліся пад заказ, калі пакупнікі дакладна вызначалі канфігурацыю дыска. Падазроныя затрыманыя, вядзецца следства.**

◢ У амерыканскім штаце Арызона глядачка загінула падчас гонак аўтамабіляў з вялікімі коламі. У аднаго з аўтамабіляў, які загарэўся, адарвалася кола і ўпала на жанчыну, якая сядзела на трыбуне. Пацярпелую адразу ж даставілі ў бальніцу, аднак урачы не змаглі выратаваць яе жыццё. Вядзецца расследаванне.

## Поўны абзац

◢ **Пяцігадовы хлопчык з Румыніі пабіў сусветны рэкорд па адцісканні на руках. Джуліяна Строэ з самага ранняга ўзросту трэніруе яго бацька, які і сам раней займаўся гімнастыкай. Хлопчыку ўдалося адціснуцца 20 разоў толькі на руках — яго ногі не датыкаліся да зямлі. Папярэдні рэкорд — 12 адцісканняў.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**Наблюдательный совет ОАО «Світанак» г. Жодино сообщает, что 25 марта 2010 г. в 15.00 в актовом зале административно-бытового корпуса, расположенного по адресу: ул. 8 Марта, 1, состоится общее очередное собрание акционеров**

**Повестка дня:**

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
2. О результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества.
4. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия, и выплате дивидендов за 2009 год.
5. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2009 год.
6. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2009 году.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждений членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Утверждение «Регламента работы ОАО «Світанак» г. Жодино с реестром владельцев ценных бумаг».
10. Внесение изменений в Устав Общества и изложение Устава в новой редакции.
11. Предоставление безвозмездной (спонсорской помощи) на 2010 год.

Регистрация участников собрания будет производиться с 13.00 до 14.50 в день и по месту проведения собрания по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — по доверенности. Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2010 года.

**Справки по телефону: 3 72 78.** УНП 600038919

## Уважаемые акционеры ОАО «РЕСТОРАН «БЕЛАРУС»!

**26.03.2010 года СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ ГОДОВОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «РЕСТОРАН «БЕЛАРУС», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15 а.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет Наблюдательного совета о работе в 2009 г.
2. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 г. и перспективах развития Общества на период 2010 г.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии и заключении по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков и годовому отчету Общества. Ознакомление Общества с заключением аудитора.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2009 г.
5. О распределении прибыли за 2009 г. и выплате дивидендов за 2009 г.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2010 г. и в 1 квартале 2011 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. О размерах и условиях вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

С материалами к собранию можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15 а, с 19 марта по 25 марта 2010 года (время работы с 9.00 до 17.00) либо 26 марта 2010 года по месту проведения собрания. Тел. 293 17 17.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 15.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 26 марта 2010 года, 15.00.**

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 26 февраля 2009 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100055804.

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «БЕЛОМО-СТРОЙ»

**31 марта 2010 года** состоится общее собрание акционеров **ОАО «БелОМО-Строй»** (далее — Общество), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, д. 114, пом. 712.

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, д. 114, пом. 712.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет управляющей организации об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 г. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2010 г.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 г.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 г.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 г.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли и расходов на потребление, а также выплате дивидендов за 2009 год.
6. Об утверждении направлений использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2010 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. Об утверждении размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Об утверждении регламента работы акционерного общества с реестром владельцев ценных бумаг.
10. О заключении договора передачи полномочий единоличного исполнительного органа Общества.
11. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, д. 114, пом. 712 **<u>25–26, 29–30 марта 2010 года</u>** (время работы с 9.00 до 18.00) либо **31 марта 2010 года** по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 13.45 до 14.00** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания — 31 марта 2010 года, 14.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 26 марта 2010 г.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНП 100626320

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

25 лютага 2010 г.
№ 8 (202)


АДКРЫТЫ ФОРУМ

## І АДЗІН У ПОЛІ ВОІН, КАЛІ ЁН — ДЭПУТАТ

*Падыходзіць да завяршэння тэрмін работы дэпутатаў 25-га склікання. Што было зроблена за 4 гады? Як спрацавалі народныя абраннікі?*

**Сяргей КАЗЛЕНЯ, старшыня Даманаўскага сельскага Савета дэпутатаў Івацэвіцкага раёна, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі:**

— У нас было абрана 11 дэпутатаў. З іх чацвёра ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў, яшчэ столькі ж — ад 40 да 50 і тры чалавекі старэйшыя за 50 гадоў. Чацвёра дэпутатаў маюць вышэйшую адукацыю, астатнія — сярэднюю спецыяльную. Усе дэпутаты пражываюць у сваіх выбарчых акругах, чацвёра з'яўляюцца кіраўнікамі арганізацый, размешчаных на тэрыторыі сельсавета.

На аднаго дэпутата ў нас дзесьці 115 выбаршчыкаў. Пытанні, з якімі звяртаюцца людзі да дэпутатаў, датычацца ў асноўным добраўпарадкавання, стану вуліц сельскіх населеных пунктаў, вулічнага асвятлення. Бывае, нехта з мясцовых вып'е і не так сябе паводзіць. Зноў жа звяртаюцца да дэпутата. Дэпутат сельскага Савета знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці да людзей і ў яго, як і ў таго ж старэйшыны, усё навідавоку. Усе праблемы, што ўзнікаюць, мы ў Савеце вырашаем сумесна — прымаем адпаведнае рашэнне, выходзім на арганізацыі. І, зразумела, імкнёмся ўсё вырашаць станоўча для нашага чалавека. Дзякуючы актыўнай пазіцыі нашых дэпутатаў, больш аператыўна вырашаюцца пытанні з вулічным асвятленнем, была праведзена падсыпка завулка Моладзевы ў Даманава. Па падказцы дэпутата пітушчага чалавека з мясцовых накіравалі на лячэнне ад алкагалізму ў ЛПП, спадзяёмся, так для яго будзе лепш. Працуем і ў гэтым кірунку.

Тое, што ў нас чацвёра дэпутатаў — кіраўнікі арганізацый, значна палягчае нам задачу. Вы ж разумееце, радавому грамадзяніну цяжэй вырашыць нейкія пытанні жыццядзейнасці насельніцтва: трэба ісці і некага прасіць. А самому кіраўніку, маючы магчымасці (тэхніку, спецыялістаў), прасцей аказваць дапамогу нашым людзям. У сельскі Савет даволі складана набраць ТАКІХ дэпутатаў — арганізацый на тэрыторыі сельсавета не так і шмат, але мы імкнёмся падбіраць людзей з актыўнай пазіцыяй.

У нас была праблема лазневага абслугоўвання. Мы гэтае пытанне «закрылі» з дапамогай раёна. Была праблема з калектывам індывідуальных забудоўшчыкаў па падвядзенні газу (пры пракладцы газаправода ўзнікла пытанне «праколу» пад чыгункай). Гэтыя расходы хацелі ўскласці на нашых людзей, але, дзякуючы актыўным намаганням старэйшыны і дэпутатаў, сітуацыя была перагледжана і людзям кампенсавалі ўсе затраты. Было пытанне з асфальтаваннем вуліц населеных пунктаў. Сёння яны перададзены на баланс спецыялізаваных дарожных арганізацый, канкрэтна ДРБУ-178. Але стан вуліцы Партызанскай (нашай цэнтральнай вуліцы) мы ўсё ж трымаем на кантролі. Яе абавязкова трэба падправіць.

Сельсавет наш нядрэнны — ёсць і прадпрыемствы, і арганізацыі, з дапамогай якіх можна вырашыць мясцовыя пытанні. Невырашальных праблем наша насельніцтва не ўзнімае. Дзесьці ўзнікае пытанне з тэхнікай, дзесьці — з медыцынскім абслугоўваннем, дзесьці — па сістэме гандлю. Усё гэта мы вырашаем на месцы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЭРЫТОРЫЯ СНЕГУ

## ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ГАТОВЫЯ СУСТРАКАЦЬ ВЯСНУ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**На выпадак актыўнага раставання снегу — з падтапліваннем дарог і будынкаў — у сталіцы пачне дзейнічаць адпаведна план пераадолення негатыўных наступстваў.**

Такі план распрацаваны, вядома, не сёлета, аднак менавіта пасля гэтай зімы можа быць запатрабаваным. Дастаткова сказаць, што адведзеныя пад вываз снегу спецыяльныя палігоны за горадам, — перапоўненыя. А ў многіх дварах паабапал праезнай часткі ўзвышаюцца вялізныя брудна-белыя гурбы. Раставанне лёду на вадасховішчах Свіслач, Цны і Драздоў не абяцае шырокіх разліваў, аднак гульні дзяцей на аслабленым лёдзе могуць запатрабаваць намаганняў выратавальнікаў. Апошнія цалкам гатовыя да любых неспадзяванак «на вадзе і ў вадзе», паведамляюць у прэс-службе Мінскага гарадскога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Дарэчы, апошні, ліпеньскі, патоп, выкліканы ў Мінску моцнымі даждамі, прадэманстраваў дзве важныя рэчы ў пераадоленні разгулу вады. Па-першае, выявіліся «слабыя месцы» ў горадзе. А, па-другое, выратавальнікі прадэманстравалі сваю здольнасць не спасаваць перад гэтай воднай стыхіяй. Мяркуецца, праўда, што зімовая вада не будзе такой «вялікай».

Наогул у Мінску — звыш васьмідзесяці месцаў найбольш верагоднага падтаплення. Уся патрэбная для выезду на месцы затаплення тэхніка знаходзіцца ў працоўным стане. У першую чаргу работнікі МНС будуць аказваць дапамогу сацыяльна значным аб'ектам — школам, садкам, бальніцам. Гатовыя «да бою» і манеўрана-пошукавыя групы. Менавіта ў іх склад уваходзяць плаўцы, якія з дапамогай спецыяльных дошак здольныя выцягнуць тапельца з вады і перадаць медыкам для аказання належнай дапамогі.



Наогул мінімізацыяй снежных наступстваў, як і ў прынцыпе ўпарадкаваннем навакольных тэрыторый, павінны займацца адпаведныя гарадскія службы. Ліўневыя каналізацыі павінны ачышчацца ад пяску, дахі — ад наледзі. Калі ж гэта не выконваецца належным чынам у належныя тэрміны, маюць месца нешчаслівыя здарэнні, у тым ліку і гібель людзей. Як паведамлялася раней, 19 лютага ў Мінску на сталую жанчыну зваліўся кавалак наледзі. Жанчына памерла да прыезду хуткай дапамогі. У выніку звольнены дырэктар ЖЭСа № 46, яго намеснік, работнікі ЖРЭА Партызанскага раёна, адказныя за ўтрыманне жылых дамоў. Кіраўнік Адміністрацыі Партызанскага раёна атрымаў вымову, яго намеснік — папярэджанне аб няпоўнай службовай адпаведнасці, гендырэктар Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі папярэджаны аб недастатковай патрабавальнасці да падначаленых.

Да 1 сакавіка Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка павінна падаць у Мінгарвыканкам і адміністрацыі раёнаў прапановы па ўдасканаленні кіравання сістэмай ЖКГ, павышэнні працоўнай і выканаўчай дысцыпліны. Мінскае гарадское ўпраўленне МНС павінна падаць у гарвыканкам прапановы па ўдасканаленні ўзаемадзеяння з падраздзяленнямі горада па папярэджанні патэнцыйна небяспечных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, прыцягнуць да дысцыплінарнай адказнасці службовых асобаў, якія не забяспечваюць выяўленне і ліквідаванне небяспечных з'яў, што прывялі да цяжкіх наступстваў. Кіраўнікам адміністрацый раёнаў сталіцы неабходна звярнуць увагу на адсутнасць належнага кантролю і запытання з падначаленых па своечасовым і якасным выкананні даручэнняў кіраўніцтва выканкама, прыцягнуць да дысцыплінарнай адказнасці службовых асобаў, якія не ў поўнай меры арганізавалі работы па ўтрыманні тэрыторый раёна і аб'ектаў у адпаведнасці з правіламі добраўпарадкавання і ўтрымання тэрыторый, населеных пунктаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## «НАДЗЕЯ» НАШАГА ДВАРА

**Зламаная лаўка перад пад'ездам, сапсаваная агароджа, адсутнасць дзіцячай пляцоўкі ў двары... Гэтыя праблемы знаёмыя ці не кожнаму, і зноў жа ці не кожны ведае, што ў такіх сітуацыях можна паспрабаваць звярнуцца ў ЖЭС, выканкам, рай- або гарсавет. Вось толькі вынік падобных зваротаў часта вядомы загадзя: лішніх грошай ніколі нідзе няма, а таму весці «папяровыя войны» і хадзіць па інстанцыях можна гадамі. Праўда, альтэрнатыва ўсё ж ёсць. І яна — у тэрытарыяльным грамадскім самакіраванні.**

### Вакол «балючых пунктаў»

Ключы ад новай кватэры — падзея заўсёды прыемная, але раз-пораз радасць ад улазінаў разбіваецца ўшчэнт аб нядобраўпарадкаванасць навакольля. У гэтым плане новабудоўлі ў раёне вуліцы Паркавая ў Баранавічах — прыклад даволі тыповы. З аднаго боку жыхары шматпавярховак на Паркавай нібыта здолелі вырашыць ці не самае балючае «кватэрнае пытанне», але з іншага — сутыкнуліся з праблемамі малапраходных дарог, кепскага асвятлення, недахопу інфраструктуры адпачынку ў дварах.

— У такой сітуацыі перш-наперш напрошваўся цалкам лагічны варыянт — трэба скардзіцца, — распавядае **дэпутат Баранавіцкага гарсавета Анатоль БАНКЕВІЧ**. — І скаргі насамрэч «пайшлі». Аднак хутка высветлілася, што сродкаў на ўсё не хапае, вырашэнне праблем можа зацягнуцца на няпэўны час. І тады з'явілася задума: правесці агульны сход, вызначыць «балючыя пункты» і паспрабаваць аплаціць частку добраўпарадкавання пляцовак вакол сваіх дамоў з уласнай кішэні. Так у 2003 годзе ў мікрараёне ўзнік камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея».

Сёння ніхто не хавае, што ідэю «Надзеі» падтрымалі далёка не ўсе. Прыкладна трэць жыхароў новабудоўляў ставяцца да збору грошай далёка не адназначна, і гэта — іх поўнае права, ніякага прымусу ў такой далікатнай справе быць проста не можа. І ўсё ж большасць не супраць рабіць своеасаблівыя «ўзносы». Бо назваць іх сумы «завоблачнымі» нельга. А сам па сабе праект стаў прыносіць двайную карысць.

— Адыграў сваю ролю і яшчэ адзін момант — па сутнасці, сродкі людзей забяспечваюць фінансаванне канкрэтных задач па добраўпарадкаванні толькі на чвэрць, — працягвае Анатоль Банкевіч. — Калі ўлады горада пабачылі ініцыятыву знізу, яны адразу пайшлі насустрач і выказалі згоду часткова «заахвоціць» разумныя ініцыятывы бюджэтнымі сродкамі. А плюс да таго «Надзеі» патрапіла адшукаць спонсарскую дапамогу — балазе, фондаў, што садзейнічаюць развіццю мясцовага самакіравання, у той жа Еўропе шмат.

Прыцягнуць апошнюю крыніцу аказалася складана — спатрэбілася зарэгістравацца ў якасці юрыдычнай асобы, падабраць офіс, адкрыць разліковы рахунак. Але галоўнае, што праект працуе, а колькасць шматпавярховікаў, якія аб'ядноўваюцца ў «Надзеі», пакрысе ўзрастае. Сёння у камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ўжо уваходзяць 17 дамоў — у іх пражываюць каля 4 тысяч чалавек.

### Рух у сустрэчным напрамку

Варта заўважыць, што прыклад «Надзеі» не ўнікальны. Але разам з тым казаць, што камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (ТГС) сталі распаўсюджанай з'явай, таксама нельга. Пакуль у Беларусі іх... адзінкі.

— З пункту гледжання цяперашняга заканадаўства асаблівых бар'ераў для стварэння і работы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання няма, працэдура рэгістрацыі тут даволі простая, дастаткова выканаць усяго некалькі пунктаў, — зазначае **начальнік упраўлення па ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання сакратарыята Савета Рэспублікі Аляксей СЦЕПАНЕНКА**. — Аднак галоўная перашкода — недахоп ініцыятывы з боку нашых людзей.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ВЫБАРЫ-2010

## Народнае вылучэнне

### Амаль 17 тысяч ініцыятыўных груп будуць збіраць подпісы ў падтрымку патэнцыйных кандыдатаў

**Да сярэдзіны сакавіка мы застаёмся на хвалі вылучэння. Увесь гэты час працоўныя калектывы, партыі і грамадзяне «прапануюць» сваіх прэтэндэнтаў для ўдзелу ў перадвыбарнай гонцы.**

— Вылучэнне ад працоўных калектываў праходзіць па прынцыпе адно прадпрыемства — адзін кандыдат, — расказвае сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай ЛАЗАВІК. — Прычым у абласны Савет працоўны калектыў можа вылучыць кандыдата толькі ў той акрузе, дзе знаходзіцца прадпрыемства ці арганізацыя працоўнага калектыву. А ў раённы, гарадскі Саветы — пры ўмове, што гэта прадпрыемства знаходзіцца на тэрыторыі горада ці раёна. Вылучэнне ад палітычных партый — самы просты спосаб: пасяджэнне кіруючага органа (абласной, раённай ці гарадской арганізацыі партыі) дазваляе вырашыць праблему на працягу некалькіх гадзін. Тым больш, што, паводле новага заканадаўства, партыя можа вылучыць кандыдата ў дэпутаты адпаведнага ўзроўню, нават калі ў яе няма ніжэйшых арганізацыйных структур у акругах. Так, напрыклад, абласная партыйная арганізацыя каля сотні чалавек (у якой, магчыма, і няма шырокай сацыяльнай базы ў гэтай вобласці) можа закрыць усе 60 акруг па выбарах дэпутатаў абласнога Савета.

Аднак пры усёй немудрагелістасці працэдуры вылучэння «сваімі сіламі», партыі звычайна выкарыстоўваюць дадатковы шанц, які дае ім збор подпісаў. Магчыма, для падстрахоўкі, а можа і для дадатковых бонусаў:

— Пасля рэгістрацыі ініцыятыўнай групы на працягу ўсяго перыяду вылучэння (з 14 лютага па 15 сакавіка) можна працаваць з выбаршчыкамі — пікеты ўсталёўваць, пакватэрны абход праводзіць. Гэта дадатковая магчымасць пазнаёміць са сваім кандыдатам, можна расказаць пра яго праграму, можна папрасіць выбаршчыкаў падтрымаць яго — не толькі падчас збору подпісаў, але і надалей — пры галасаванні на выбарчым участку. Таму напэўна ініцыятыўных груп зарэгістравана дастаткова шмат. Хоць на мой погляд, колькасць подпісаў, якія трэба сабраць, невялікая, і нейкія пікеты ўсталёўваць наўрад ці камусьці давядзецца. Давайце падлічым: калі ініцыятыўная група, возьмем па максімуму — 10 чалавек, збірае подпісы ў падтрымку кандыдата абласнога Савета, ёй на працягу месяца неабходна назапасіць 150 подпісаў. Атрымліваецца, што адзін подпіс кожнаму члену ініцыятыўнай групы можна два дні збіраць! Неабходнасць у пікетах, на мой погляд, адпадае.

У барацьбе за подпісы выбаршчыкаў у гэтай электаральнай кампаніі возьмуць удзел 16 860 патэнцыйных кандыдатаў (тэрмін падачы заяў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп скончыўся, і апошнія рашэнні па іх выбаркамы прынялі 23 лютага). Сярод іх — 341 прадстаўнік палітычных партый.

— Калі суаднесці колькасць акруг і пададзеных заяў, то прыблізна дзве траціны выбарчых акруг маюць ініцыятыўныя групы.

Увогуле ж спробу зрабілі 16 903 патэнцыйныя кандыдаты, аднак 20 сышлі з дыстанцыі самі — адклікалі свае заявы, а яшчэ 23-ом было адмоўлена. Дарэчы, на гэтых выбарах адмоў, паводле інфармацыі М. Лазавіка, значна менш (у папярэднюю электаральную кампанію было адмоўлена ў рэгістрацыі больш як 100 ініцыятыўных груп). І заявы абсалютнай большасці партыйцаў задаволеныя, выпадкі адмоў ім былі адзінкавымі.

Сярод партыйцаў, у падтрымку якіх будуць збірацца подпісы, больш за ўсё прадстаўнікоў КПБ, у тройцы лідараў таксама БНФ і АГП. Зарэгістраваныя таксама ініцыятыўныя групы прадстаўнікоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), Беларускай Аграрнай партыі, Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», Партыі зялёных, партыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай «Грамада», Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі, Ліберальна-дэмакратычнай партыі, Беларускай патрыятычнай партыі і Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці.

Увогуле ж ініцыятыўных груп утворана некалькі болей, чым на папярэдніх мясцовых выбарах. Ці можна рабіць папярэднія высновы аб тым, што гэтыя мясцовыя выбары будуць праходзіць больш актыўна?

— Пакуль гаварыць пра актыўнасць выбараў ранавата, — мяркуе сакратар ЦВК. — Найбольшая актыўнасць пачынаецца з агітацыйнай кампаніяй. Пакуль магу сказаць толькі, што палітычныя партыі выкарыстоўваюць тыя перавагі, якія даюць ім змены ў выбарчым заканадаўстве і дастаткова актыўна вылучаюць сваіх прадстаўнікоў і ў камісіі, і кандыдатамі ў дэпутаты. Аднак хацелася б адзначыць, што следам за колькаснымі паказчыкамі павінна ісці якасць, каб не атрымалася падмены якасці колькасцю. На жаль, пры вылучэнні прадстаўнікоў у склад камісій былі выпадкі, калі вылучаліся людзі, якія цяжка хварэюць і не могуць працаваць у камісіях, былі таксама людзі, якія па сваіх маральных якасцях абсалютна не карыстаюцца аўтарытэтам у насельніцтва — судзімыя за даволі сур'ёзныя крымінальныя злачынствы. І пажадана, каб пры вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты, суб'екты, якія вылучаюць, не дапускалі такіх памылак.

Вылучэнне тым часам працягваецца, утвораныя ўжо ўчасткі для галасавання. Адпаведна распачнецца і вылучэнне ў склад участковых выбаркамаў (да 7 сакавіка), ад якога традыцыйна чакаюць найбольшай актыўнасці палітычных сілаў. Так што ўсё самае цікавае — наперадзе.

## У бой ідуць прадпрымальнікі

### Патэнцыйны кандыдат у дэпутаты — бізнэсмен

На апошнім пасяджэнні Цэнтрвыбаркама былі абмеркаваныя ўсе нюансы галасавання асуджаных да арышту. Прынятая адпаведная пастанова. Па сутнасці працэдура будзе аналагічнай галасаванню грамадзян па месцы знаходжання:

— Галасаванне асуджаных да арышту арганізуе ўчастковая камісія таго ўчастка для галасавання, на тэрыторыі якога знаходзіцца ўстанова, што выконвае пакаранні, — патлумачыла **член ЦВК Надзея КІСЯЛЁВА**. — Кіраўнік установы не пазней чым за 15 дзён да дня выбараў (гэта значыць 9 красавіка) падае ва ўчастковую выбарчую камісію спіс гэтай катэгорыі грамадзян. Напярэдадні дня галасавання кіраўнік паведамляе ў гэтую ж камісію, хто з названай катэгорыі грамадзян хоча ўзяць удзел у галасаванні. Галасаванне ў гэтых установах арганізуецца з выкананнем усіх патрабаванняў выбарчага заканадаўства.

Паводле слоў Надзеі Кісялёвай, гэта катэгорыя вельмі нязначная — 1628 грамадзян. Лічба, натуральна, неканстантная, паколькі тэрмін арышту складае ад аднаго да шасці месяцаў, і да самых выбараў — 25 красавіка — статыстыка можа змяніцца. «Аднак у любым выпадку гэта невялікая колькасць», — падкрэсліла член Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

**Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА** ў гутарцы з журналістамі пасля пасяджэння адзначыла, што працэс вылучэння кандыдатаў ідзе актыўна, і нават падзялілася першымі назіраннямі па «якасным» складзе магчымых прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат:

— Калі гаварыць аб партрэце патэнцыйнага кандыдата цяпер, то гэта прадпрымальнік — ці прыватны, ці ў рангу кіраўніка буйнога прадпрыемства, акцыянернага таварыства ці таварыства з дадатковай адказнасцю. Ёсць персаналіі, досыць вядомыя, у Мінску, у прыватнасці. Прычым вельмі цікавая сітуацыя па адной сталічнай выбарчай акрузе — Каменная Горка, раён новай забудовы: там пададзеныя дакументы на рэгістрацыю дзвюх ініцыятыўных груп, прычым адна — дырэктара «МАПІД», а другая — старшыні таварыства падманутых забудоўшчыкаў. Вось гэта і ёсць сапраўдная альтэрнатыва, два бакі, якія супрацьборствуюць, па адной выбарчай акрузе.

**Ала МАЧАЛАВА.**

СЕСІЯ

## ЭКАНОМІКА АПТЫМІЗМУ

**На апошняй сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў галоўнымі пытаннямі сталі эканамічнае становішча і шанаванне лепшых органаў мясцовага самакіравання.**

Дэпутаты абмяркоўвалі справаздачы Магілёўскага аблвыканкама і Прэзідыума абласнога Савета. Праўда, выступленні з месцаў больш нагадвалі бравурныя справаздачы — са сціплымі ўкрапінамі крытыкі, просьбаў і прапаноў.

Напрыклад, з Касцюковічаў просяць дапамагчы з пабудовай сучаснага фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Старшыні розных сельскіх Саветаў мараць аб атрыманні ў бюджэт часткі падаходнага падатку з працаўнікоў вёсак. Ёсць праблемы з перадачай мясцовых дарог на баланс дарожных арганізацый. Аграгарадку Бацвінаўка не хапае прыватнай ініцыятывы, развіцця экатурызму і народных промыслаў.

Падрыхтаваныя даклады так спраўна чыталіся ў мікрафон, што ўрэшце **старшыня абласнога Савета Уладзімір ПАНЦЮХОЎ** загаварыў аб зменах у рэгламенце і жартам прапанаваў аддаваць у сакратарыят свае паперкі не пасля выступлення, а да яго, каб ад сябе казаць тое, што сапраўды важна і хвалюе.

Паток стандартнага аптымізму з трыбуны нарэшце спыніў **памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь ЛАЎРАНКОЎ**. Ён нагадаў прысутным, што аптымістычны настрой справаздачаў не мае пад сабой трывалага падмурка: з прагнозных паказчыкаў летась выканана толькі частка, бюджэт не атрымаў вялікую суму грошай.

— У гэтай складанай сітуацыі ўдалося ўтрымаць эканоміку, не дапусціць абвалу — сапраўды так, але гэта не нагода для супакаення, бо задачы на гэты год стаяць надзвычай сур'ёзныя, — сказаў Генадзь Лаўранкоў.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Вадзім ПАПОЎ** у сваім выступленні вярнуў магілёўцаў, як кажуць, на зямлю.

— Пагалоўе жывёлы ў Магілёўскай вобласці скарацілася ў параўнанні з 1990 годам істотна: толькі кароў стала на 39 працэнтаў меней, — прывёў Вадзім Папоў цікавыя лічбы. — Толькі некаторыя з сельскіх раёнаў вырабляюць столькі ж малака і мяса, як 20 гадоў таму.

На яго погляд, скарачэнне пагалоўя негатыўна адбілася на напаўненні жывёлай новапабудаваных сучасных фермаў: між тым, яны хутка павінны даваць прыбытак, каб вяртаць хоць бы працэнты па крэдытах, за якія былі пабудаваныя.

— Цяпер трэба не проста за лічбамі гнацца, а атрымліваць прадукцыю і грошы за яе рэалізацыю: за станоўчую дынаміку ў банку грошай не дадуць, — падкрэсліў Вадзім Папоў. — У аграпрамысловым комплексе трэба павялічваць аб'ёмы вытворчасці і скарачаць выдаткі, каб плаціць сваім работнікам прыстойны заробак.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЭМА ДНЯ

## Не канстатаваць, а ўплываць

**На мінулым тыдні Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання на спецыяльным пасяджэнні падвёў вынікі сваёй работы за мінулы год. Наўрад ці мерапрыемства можна было назваць справаздачай у звычайным разуменні гэтага слова. Удзельнікі сустрэчы паспрабавалі разабрацца, ці здолелі мясцовыя Саветы дэпутатаў стаць паўнапраўнымі гаспадарамі на сваіх тэрыторыях. Адказ на гэта пытанне, агучаны старшынёй Савета па ўзаемадзеянні, Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Барысам БАТУРАМ, быў несуцяшальным. І для многіх аказаўся нечаканым...**

### Зверху ўніз і знізу ўверх

Падрабязна аб асноўных кірунках работы вышэйназванай структуры расказаў **член Савета па ўзаемадзеянні, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Генадзь НАВІЦКІ**. Ён адзначыў, што дасягненне тых ці іншых канкрэтных вынікаў у рабоце Савета забяспечваецца дзякуючы ўсебаковаму вывучэнню найбольш актуальных пытанняў рэгіёнаў і «глыбінкі». Гэтыя пытанні, а таксама шляхі іх вырашэння разглядаюцца на выязных пасяджэннях, семінарах, практычных занятках і сустрэчах са старшынямі Саветаў дэпутатаў базавага і першаснага ўзроўняў. Падчас такіх сумесных мерапрыемстваў Савет па ўзаемадзеянні якраз і «падпітваецца» праблемамі знізу. І ўжо на сваім узроўні (звярнуўшыся ў адпаведныя органы дзяржаўнага кіравання) дабіваецца іх вырашэння.

У якасці аднаго з прыкладаў была прыведзеная сустрэча са старшынямі пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў, на якой узніклі пытанні па «тэме» вулічнага асвятлення сельскіх населеных пунктаў. Рэч у тым, што ў свой час па прапанове Савета па ўзаемадзеянні Міністэрства энергетыкі зацвердзіла Тыпавое палажэнне па абслугоўванні сетак вулічнага асвятлення ў вёсках. Аднак ажыццяўленне некаторых яго пунктаў на практыцы аказалася праблематычным. (Напрыклад, здыманне паказанняў аб скарыстанай электраэнергіі, ускладзенае на старастаў; набыццё і ўтылізацыя лямпачак, ускладзеныя на сельскія Саветы.)

Па выніках сустрэчы былі падрыхтаваныя прапановы аб унясенні змяненняў у Тыпавое палажэнне. Сёння дасягнутая дамоўленасць з кіраўніцтвам Міністэрства энергетыкі аб тым, што здыманнем паказанняў аб скарыстанай электраэнергіі, а таксама набыццём і ўтылізацыяй лямпачак будуць займацца спецыялізаваныя прадпрыемствы.

Так што пошукі новых падыходаў у рабоце з органамі прадстаўнічай улады ў цэлым пазітыўна ўплываюць на дзейнасць апошніх, адзначыў Генадзь Навіцкі (тэкст яго выступлення ў скарочаным выглядзе змяшчаецца на 2-й стар.).

### «Разнос» наўздагон

Расказваючы пра захады, якія робяць мясцовыя Саветы дэпутатаў Гомельскай вобласці для забеспячэння законнасці і правапарадку, **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Валерый СЯЛІЦКІ** рэзюмаваў: вынік, адэкватны намаганням, на жаль, не дасягнуты. У вобласці на фоне агульнага зніжэння ўзроўню злачыннасці вырасла колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў.

— Але ў нас чамусьці склалася практыка «разносаў» і «разбораў» наўздагон фактам, якія ўжо мелі месца. Замест таго, каб думаць пра гэта загадзя, — канстатаваў Валерый Сяліцкі.

Летам мінулага года дэпутаты Гомельскага абласнога Савета наведалі жаночую калонію. Яна перапоўненая і пашыраецца. Жаночы алкагалізм прагрэсуе і маладзее, як і жаночая злачыннасць. Між тым, кіраўнікі шэрагу арганізацый не хочуць бачыць гэту праблему. А мясцовым Саветам, сельскім выканкамам не ўдаецца арганізаваць належную работу з насельніцтвам па прычыне загружанасці працаёмкімі працэдурамі.

Валерый Сяліцкі прапанаваў распрацаваць у кожным Савеце праграму карыснай занятасці насельніцтва, якая ахоплівала б як мага больш кірункаў па інтарэсах і дазваляла па максімуму загрузіць вольны час людзей.

— Напэўна, неабходна спачатку загрузіць іх працай, — заўважыў Барыс Батура. — Бо насельніцтва ў сельскай мясцовасці загружанае працай не поўнасцю. У сельгаспрадпрыемствы прыйшла высокая механізацыя, у выніку вызваляюцца людзі. Пры гэтым задачы, запісаныя ў праграме адраджэння і развіцця вёскі — аб неабходнасці стварэння новых працоўных месцаў — на жаль, не выконваюцца. І органы мясцовага самакіравання не заўсёды ўплываюць на выканаўчую ўладу ў іх вырашэнні.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

# І АДЗІН У ПОЛІ ВОІН...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

**Ала ЛАПАНОВІЧ, старшыня Зелянкоўскага сельскага Савета дэпутатаў Полацкага раёна:**

— У нашым сельскім Савеце 12 дэпутатаў. Гэта, натуральна, нашы жыхары: механізатары, работнік пошты, загадчыца крамы, ляснік. У 2009 годзе ў нас быў адкрыты аграгарадок у вёсцы Зялёнкі, што дазволіла нам аднавіць сваю сферу сацкультбыту. Але былі пытанні па бальніцы сястрынскага догляду ў вёсцы Сястронкі. Бальніца на нашай тэрыторыі ўжо шмат гадоў. Там цяпер ложкі сацыяльнага догляду, куды нашы людзі могуць легчы і паправіць сваё здароўе. Людзі хваляваліся — ці не закрыюць бальніцу, бо такія чуткі хадзілі... У выніку яе пакінулі дзейснай, нават зрабілі касметычны рамонт. Яшчэ нас непакоіла праца крамаў. Паколькі насельніцтва мала і яго колькасць пастаянна скарачаецца, стацыянарныя крамы пачалі зачыняцца. Людзі непакоіліся — што ж будзе далей. Але новая практыка абслугоўвання аўтакрамай паказала, што гэта вельмі зручна. Два разы на тыдзень аўтакрама праязджае па самых аддаленых вёсках, і людзей гэта задавальняе.

Вялікай праблемай у нас былі двухпавярховыя дамы. Яны знаходзіліся на балансе сельскагаспадарчага прадпрыемства «Зялёнка». У самой гаспадаркі грошай небагата, таму пытанне рамонту дахаў, добраўпарадкавання пад'ездаў гэтых дамоў завісала ў паветры. Да нас ішлі пастаянныя скаргі ад насельніцтва. Трэба было нешта рабіць. Два гады таму ўсе гэтыя дамы мы перадалі на баланс Ветрынскага ЖКГ. Рашэнне аб перадачы прымаў раён, але з прапановай выходзіў сельскі Савет.

Аўтарытэт і эфектыўнасць работы дэпутата залежыць ад самога дэпутата. Ёсць людзі неабыякавыя, якія бачаць усе праблемы сваёй акругі, сваіх выбаршчыкаў. Трэба ўлічваць, што гэта праца на грамадскіх пачатках, а людзі цяпер прывыкаюць, што за ўсё трэба плаціць. Прыемна ўсведамляць, што ёсць яшчэ альтруісты.

**Рыгор ПАЗНЯК, старшыня Чашніцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— У раённым Савеце сёння 38 дэпутатаў. Прыкладна трэць з іх былі абраны ў 25-м скліканні не ўпершыню. Калі акрэсліць кола пытанняў, з якімі звярталіся да нас выбаршчыкі, варта ўзгадаць добраўпарадкаванне (асабліва ў сельскай мясцовасці), водазабеспячэнне, забеспячэнне палівам. Да гэтага года ў нас існаваў пазабюджэтны фонд, куды залічваліся добраахвотныя адлічэнні і ахвяраванні грамадзян і дзякуючы якому былі вырашаныя многія пытанні. Напрыклад, у Новалукомлі абсталяваныя дзве дваровыя тэрыторыі. У Прызямлянскім сельскім Савеце адрамантаваны дарогі і агароджаны могілкі. Дзесьці быў праведзены рамонт водаразборных калонак, водаправодаў, калодзежаў. І ўсё гэта — дзякуючы добраахвотным узносам грамадзян і актыўнаму ўдзелу старэйшын і дэпутатаў — сельскіх і раённага Саветаў. Аднак калі работа старэйшын у нас заахвочваецца матэрыяльна, то дэпутаты працуюць на добраахвотнай аснове.

За 2009 год мы правялі неаднаразовыя выезды мабільных груп райвыканкама і райсавета ў кожны сельскі Савет, пабывалі практычна ў кожным населеным пункце і нават неаднаразова (так у нас праходзіць Дзень працы з насельніцтвам). Задзейнічаем у гэтай рабоце і старэйшын, і дэпутатаў. Пры гэтым адразу бачым актыўнасць і эфектыўнасць работы нашых дэпутатаў пярвічнага ўзроўню. І вынікі, я скажу, ёсць. Калі дэпутацкі корпус актыўны, то бачныя і канкрэтныя вынікі іх работы. Што датычыцца вырашэння пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, асабліва эфектыўна гэтая работа вядзецца ў сельскай мясцовасці. Там дэпутат і старэйшына — наша апора.

Цяпер укараняем у раёне новую практыку — уводзім у сельвыканкамы рабочага па абслугоўванню тэрыторыі і бягучым рамонце, якога задзейнічаем са службы ЖКГ. Ужо ёсць станоўчыя прыклады такога супрацоўніцтва ў Кругліцкім сельсавеце. У перспектыве мы гэту практыку збіраемся распаўсюдзіць на ўсе сельсаветы.

**Васіль КАНОПЛІЧ, старшыня Махновіцкага сельскага Савета дэпутатаў Мазырскага раёна:**

— На тэрыторыі сельсавета ўсяго 6 вёсак, дзе пражывае каля 1000 чалавек. У 25-м скліканні ў нас было абрана 11 дэпутатаў. З улікам таго, што насельніцтва ў нас нешматколькаснае, з усімі сваімі пытаннямі людзі адразу ідуць у сельскі Савет, а не да свайго дэпутата. Але дэпутаты бяруць актыўны ўдзел у рэалізацыі Дэкрэта №18 і іншых дакументаў і праграм сацыяльнай скіраванасці. Выдатна працуюць нашы ўпаўнаважаныя (у іншых месцах іх называюць старэйшынамі). Асабліва ў аддаленых вёсках. Бывае, у старшыні Савета то тэхнікі няма, то бензіну, каб туды з'ездзіць самому, ды і кожны дзень не наездзішся. А ўпаўнаважаны заўсёды праінфармуе аб сітуацыі ў сваім населеным пункце.

Ад дэпутатаў новага склікання мы чакаем актыўнасці і падтрымкі — можа, не толькі і не столькі справай (самастойна яны могуць і не справіцца з сур'ёзнай праблемай), але і словам, парадай. Збоку яно ж усё бачна лепей. У мяне быў дэпутат «са стажам», пенсіянер. Ён неяк прапанаваў падсыпаць вуліцу Савецкую ў Забалацці. Там жывуць пенсіянеры, былыя работнікі мясцовага калгаса. Некалі па вуліцы калгасная тэхніка вазіла гной і «разбіла» дарогу-гравійку. «Давай зробім добрую справу, — звярнуўся да мяне дэпутат. — Паспрабуем арганізаваць падсыпку.» Хоць нашы дарогі перададзены ЖКГ, але грошай жа ўсё адно на іх няма. Мы падключылі дэпутатаў, саміх пенсіянераў, тыя напісалі ліст у мой сельскі Савет. А я з ім звярнуўся адразу да дарожнікаў. Людзі просяць, кажу, вось, бачыце подпісы. Што вы думаеце — летась зрабілі падсыпку, 900 метраў даўжыні і 4 метры шырыні. А з ініцыятывай выступіў адзін чалавек, дэпутат.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

# Не канстатаваць, а ўплываць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

## Патрэбны быў «штуршок»

На думку **старшыні Шумілінскага раённага Савета дэпутатаў Ірыны НОВІКАВАЙ**, роля органаў мясцовага кіравання і самакіравання значна ўзрасла пасля прыняцця Указа № 21. Да гэтага Саветы таксама працавалі з насельніцтвам, але заставалася шмат неўрэгуляваных пытанняў. Такіх, як утрыманне вуліц, дарог, водаправодных сетак і калодзежаў, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне Саветаў і фарміраванне бюджэтаў першаснага звяна ўлады.

Пасля прыняцця ўказа ў Шумілінскім раёне (як і ў Віцебскай вобласці ў цэлым) кардынальна змяніліся падыходы да фарміравання першасных бюджэтаў. Сёння ад іх структуры рэальна залежыць зацікаўленасць мясцовай улады ў развіцці сваіх тэрыторый. Таму рэгулюючай даходнай крыніцай, якая мае найбольшую ўдзельную вагу ў агульнай суме даходаў, з'ўляецца падаходны падатак з фізічных асобаў. Так званай «базай» для налічэння выступаюць аб'екты інфраструктуры — адукацыі, аховы здароўя, культуры, а таксама сельгаспрадпрыемствы, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсаветаў.

Што ў выніку? Калі да рэалізацыі ўказа ўласная даходная частка першасных бюджэтаў ледзь дацягвала да 10 працэнтаў, дык цяпер яна складае 70 працэнтаў і больш.

Таксама ў адпаведнасці з Указам № 21 вуліцы сельскіх населеных пунктаў раёна з мінулага года перададзены на баланс жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Балансаўтрымальнік, такім чынам, вызначаны. Як і сума фінансавання на год: на 138 км вуліц — 48 млн рублёў, якія размеркаваны ў бюджэты першаснага ўзроўню.

— Грошай не шмат, — пагаджаецца Ірына Новікава. — Але ж раней і гэтага не было, фінансаванне сельскіх вуліц не прадугледжвалася ўвогуле. А цяпер вырашэнне праблемы скранулася з «мёртвай кропкі». З'явіліся зрухі і па іншых кірунках, і гэта добра. Таму што людзі не павінны быць закладнікамі нявырашаных праблем.

— Дзякуючы Указу Прэзідэнта № 21 мы сапраўды пачалі варушыцца, — пагадзіўся Барыс Батура. — Але вы павінны звярнуць увагу на іншы момант. Няўжо кожны раз, каб пачаць нешта канкрэтнае рабіць, неабходны штуршок з боку дзяржавы? Чаму раней нельга было прадугледзець у бюджэтах стварэнне і ўмацаванне матэрыяльнай базы першаснага ўзроўню ўлады, знайсці гаспадара водаправода або калодзежа? Гэтыя праблемы былі відавочныя і зразумелыя для ўсіх, але імі ніхто не займаўся. А роля мясцовага самакіравання якраз і заключаецца ў тым, каб бачыць праблемы і дабівацца іх вырашэння. Няўжо раней Саветы не маглі вынесці на сесію гэту відавочнасць, паставіць пытанне перад выканаўчай уладай? Маглі. Але не паставілі. Значыць, гаварыць аб тым, што мясцовае самакіраванне дасягнула нейкіх вышыняў, яшчэ рана.

## Знайшоў кліента — аддай аб'ект

Усе іншыя пытанні, на якіх засяроджвалі ўвагу ўдзельнікі сустрэчы — здзяйсненне мерапрыемстваў у межах Года роднай зямлі, прыцягненне насельніцтва да вырашэння мясцовых пытанняў, пашырэнне і ўмацаванне падатковай базы сельсаветаў — таксама разглядаліся з пункту гледжання ролі дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Актыўная работа мясцовай улады Дзяржынскага раёна па стварэнні новых прадпрыемстваў і, адпаведна, працоўных месцаў (у тым ліку і ў сельскай мясцовасці) дала магчымасць сфарміраваць там бездатацыйны бюджэт. Прычым не толькі на раённым узроўні. Сёння за кошт выключна ўласных крыніц фарміруюцца бюджэты 6 сельсаветаў.

— Аднак я перакананы, што той узровень самафінансавання, якога дасягнулі ў Дзяржынскім раёне, можа быць на парадак вышэйшы, — лічыць старшыня Савета па ўзаемадзеянні. — Часам для таго, каб атрымаць у гэтым раёне пусты будынак, патэнцыйнаму прадпрымальніку трэба патраціць 3-4 месяцы... А між тым, мы павінны — і дзяржаўная палітыка на гэта накіравана — павярнуцца ў бок развіцця малога прадпрымальніцтва, пераадолець бюракратызм. Знайшлі кліента — аддайце яму аб'ект за адну базавую велічыню. І ўсё будзе нармальна, падаткі ў бюджэт пойдуць... А сельскія Саветы разам з раённым Саветам тут недапрацоўваюць.

## Пазіцыя... згоды

Падводзячы вынікі работы Савета па ўзаемадзеянні за мінулы год, Барыс Батура адзначыў, што пэўныя зрухі ёсць, з'явіліся паслядоўнасць і сістэмнасць. Нешта змяняецца і на месцах, на першасным і базавым узроўнях.

— Але галоўнага мы, на жаль, не дасягнулі — Саветы не сталі паўнапраўнымі гаспадарамі на падведамных тэрыторыях. Пакуль што яны ў асноўным фіксуюць усё тое, што робіць выканаўчая ўлада, і практычна не ўплываюць на вырашэнне праблем тэрыторый — хіба што праз рэагаванне на скаргі і заявы грамадзян. А хто, скажыце, уносіў якія-небудзь карэктывы ці прапановы на стадыі распрацоўкі праграм развіцця рэгіёнаў? Фармальна праграмы абмяркоўваюцца дэпутатамі, але пасля абмеркавання чамусьці застаюцца нязменнымі. Дэпутацкі ўплыў — якраз тое, чаго нам не хапае і чаго трэба дабівацца. Гэта не азначае канфрантацыю з выканаўчай уладай. Проста трэба больш актыўна выказваць сваю пазіцыю, імкнуцца ўлічваць усе патрэбы насельніцтва.

**Наталля КАРПЕНКА.**

Член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Генадзь НАВІЦКІ:

# «МОЖНА СЦВЯРДЖАЦЬ, ШТО САВЕТ СКЛАЎСЯ»

– Вялікае значэнне для Рэспублікі Беларусь мае развіццё інстытута мясцовага самакіравання. Для павышэння яго эфектыўнасці амаль тры гады таму пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь быў створаны Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання.

Адным з асноўных кірункаў дзейнасці Савета стала абмеркаванне на пасяджэннях найбольш надзённых і актуальных праблем у рабоце мясцовых Саветаў дэпутатаў. У якасці прыкладу можна прывесці пасяджэнне, прысвечанае павышэнню ролі дэпутатаў і пастаянных камісій Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў у рэалізацыі асноўных задач сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы. Была адзначана станоўчая дынаміка ў яго рабоце па рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця. Але Саветам па ўзаемадзеянні было прынятае рашэнне рэкамендаваць прэзідыуму, пастаянным камісіям і дэпутатам Мінгарсавета больш актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні праблем у сферы камунальнай гаспадаркі, транспартнага і гандлёвага абслугоўвання, экалогіі, землекарыстання, добраўпарадкавання і аховы здароўя.

У практыку Савета па ўзаемадзеянні паступова ўваходзіць правядзенне выязных пасяджэнняў. Так, на базе Васілішкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Шчучынскага раёна адбылося пасяджэнне, прысвечанае рэалізацыі палажэнняў Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 студзеня 2007 г. № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва». Сельсавету былі дадзены рэкамендацыі па ўмацаванні даходнай часткі бюджэту, а таксама па перадачы аб'ектаў водазабеспячэння, дарог і вуліц спецыялізаваным арганізацыям. У выніку, на 1 студзеня 2010 г. усе гэтыя аб'екты ўжо знаходзяцца на іх балансе. Цяпер вядзецца перадача шахтавых калодзежаў грамадскага карыстання. Што датычыцца бюджэту сельсавета, то плануецца, што за кошт продажу зямельных участкаў, выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ў яго камунальнай уласнасці, збораў з нарыхтоўшчыкаў сельскагаспадарчай прадукцыі, аграэкатурызму ў 2010 годзе яго датацыйнасць у параўнанні з 2009 годам будзе зніжана амаль на 20 працэнтаў.

Выязное пасяджэнне таксама прайшло на базе Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў Гомельскай вобласці. Яно было прысвечана вынікам работы мясцовых Саветаў дэпутатаў у рамках Года роднай зямлі. Адзначалася, што ўсе запланаваныя органамі мясцовай улады мерапрыемствы ў раёне выконваюцца. Рэкамендавана прадоўжыць работу па зберажэнні і прымнажэнні духоўнага і культурнага набытку народа, гістарычнай спадчыны і прыродных багаццяў рэгіёна, прыцягваючы да яе грамадзян і юрыдычных асобаў усіх формаў уласнасці.

Акрамя таго, у сувязі з актуальнасцю пытання аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ладу Рэспублікі Беларусь на пярвічным узроўні, органам мясцовага самакіравання прапанавана прымаць такія рашэнні з улікам эканамічнага і сацыяльнага складнікаў тэрыторый.

Адзін з асноўных напрамкаў у дзейнасці Савета па ўзаемадзеянні — сустрэчы са старшынямі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Яны сталі эфектыўнай формай вывучэння найбольш вострых праблем і патрэб рэгіёнаў. Падчас такіх сустрэч летась быў узняты шэраг праблем, якія датычацца механізму выплаты зямельнага падатку і падатку на нерухомасць, вырашэння пытанняў землекарыстання і землеўпарадкавання, выкарыстання пустых жылых дамоў, вулічнага асвятлення сельскіх населеных пунктаў і інш. У выніку сумесна з Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі і Саветамі дэпутатаў розных узроўняў унесены адпаведныя прапановы па ўдасканальванні платы падаткаў у сельскай мясцовасці. На падставе прапаноў Савета па ўзаемадзеянні Міністэрствам энергетыкі Рэспублікі Беларусь унесеныя папраўкі ў дзейнае Тыпавое палажэнне аб парадку правядзення арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па міжрамонтным абслугоўванні сетак вонкавага асвятлення сельскіх населеных пунктаў. Гэтыя меры дазволілі ў значнай ступені вызваліць сельскія Саветы ад выканання не ўласцівых ім функцый.

Саветам па ўзаемадзеянні надаецца вялікая ўвага вывучэнню і распаўсюджванню перадавога вопыту работы органаў мясцовага самакіравання. Абагульнены і накіраваны ў абласныя Саветы дэпутатаў матэрыялы аб практыцы работы камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання Фрунзенскага раёна г. Мінска і Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў. Рабочай групай Савета па ўзаемадзеянні накіраваная на месцы запіска з канкрэтнымі высновамі і прапановамі аб практыцы работы асобных Саветаў дэпутатаў па рэалізацыі Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх населеных пунктаў на 2007—2010 гады. Прааналізавана таксама дзейнасць Саветаў дэпутатаў Гомельскай вобласці па ўключэнні ў штат сельскіх выканаўчых камітэтаў рабочых па абслугоўванні будынка і добраўпарадкаванні тэрыторыі.

У кастрычніку 2009 года праведзены семінар для старшыняў гарадскіх Саветаў дэпутатаў, на якім вывучалася практыка работы таварыстваў уласнікаў г. Мінска па кіраванні нерухомай маёмасцю сумеснага домаўладання. Яго ўдзельнікі азнаёміліся з работай унітарнага прадпрыемства «Аймалін» па абслугоўванні жыллёвага фонду таварыстваў уласнікаў, а таксама практыкай па кіраванні нерухомай маёмасцю рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Сумеснае домаўладанне».

Разам з Інстытутам дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і Мінскім абласным Саветам дэпутатаў для старшыняў раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў у лістападзе былі арганізаваны выязныя заняткі на тэму «Асаблівасці фарміравання бюджэтаў базавага і пярвічных тэрытарыяльных узроўняў на прыкладзе Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці». Гэты рэгіён быў выбраны невыпадкова — яго бюджэт з'ўляецца бездатацыйным. У раёне зарэгістравана 990 арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці (за апошнія два гады — 194). Падатковыя паступленні ад новых прадпрыемстваў у структуры раённага бюджэту складаюць 32 працэнты. У выніку значна скарацілася датацыйнасць бюджэтаў першаснага ўзроўню.

Станоўчы вопыт работы лепшых мясцовых Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання абагульняецца і накіроўваецца на месцы для выкарыстання ў практычнай дзейнасці. Усе матэрыялы па гэтай тэме таксама размяшчаюцца на Web-сайце Савета па ўзаемадзеянні.

Саветам па ўзаемадзеянні пастаянна аказваецца кансультацыйная дапамога кіраўнікам мясцовых Саветаў дэпутатаў. Гэта работа ўжо набыла сістэмны характар. Арганізавана і штодзень працуе «гарачая лінія».

Падчас сустрэч са старшынямі Саветаў дэпутатаў першаснага ўзроўню Саветам па ўзаемадзеянні было выяўлена, што структура справаводства, якая ў іх існуе, патрабуе аптымізацыі. Каля 70 працэнтаў рабочага часу супрацоўнікаў сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў затрачваецца на вядзенне ўліковых кніг, афармленне розных справаздач, даведак і да т.п. У сувязі з гэтым запланавана распрацаваць і ўкараніць аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму «Мясцовыя Саветы дэпутатаў». Акрамя таго, да рэспубліканскага інфармацыйна-аналітычнага партала, які ствараецца, плануецца падключыць і мясцовыя Саветы дэпутатаў. На гэтым партале будуць размешчаны інтэграваная база звестак па ўсіх мясцовых Саветах дэпутатаў і адпаведныя нарматыўныя прававыя акты. Выкарыстанне звестак гэтай інфармацыйнай сістэмы дазволіць вызваліць мясцовыя Саветы дэпутатаў ад руціннай папяровай працы.

Хачу асабліва адзначыць такі важны кірунак нашай дзейнасці, як міжнароднае супрацоўніцтва. Цяпер Савету па ўзаемадзеянні нададзены статус назіральніка ў Кангрэсе мясцовых і рэгіянальных уладаў Савета Еўропы. Па запрашэнні кіраўніцтва Кангрэса старшыня Савета па ўзаемадзеянні Барыс Батура і яго намеснік Анатоль Рубінаў узялі ўдзел у пленарных пасяджэннях гэтай арганізацыі. Падчас візітаў адбыўся шэраг сустрэч з яе кіраўнікамі, дзе была дасягнутая дамоўленасць аб актывізацыі двухбаковых кантактаў.

Члены Савета па ўзаемадзеянні ўзялі ўдзел і ў рабоце семінара «Умацаванне партнёрства ЕС з усходнімі суседзямі: роля мясцовых і рэгіянальных уладаў у развіцці «Усходняга партнёрства» (Славакія), а таксама азнаёміліся з вопытам работы мясцовага самакіравання Федэральнай зямлі Брандэнбург (ФРГ). У плане работы — правядзенне ў Мінску «круглага стала» па пытаннях мясцовага самакіравання з удзелам прадстаўнікоў Кангрэса, вядучых вучоных, а таксама кіраўнікоў мясцовых Саветаў дэпутатаў. Удзел у такіх міжнародных мерапрыемствах дазваляе павышаць эфектыўнасць работы ў гэтай сферы.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што Савет па ўзаемадзеянні склаўся як калегіяльны дарадчы орган. Падчас яго пасяджэнняў уносяцца прапановы па ўдасканальванні дзейнасці органаў мясцовага самакіравання, а таксама каардынуюцца пытанні іх узаемадзеяння.

# ЭКАНОМІКА АПТЫМІЗМУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Рэзервы ў вобласці ёсць, але не ўсе працавалі так, каб атрымаць найлепшыя вынікі, — прызнаў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК**. — Многія кіраўнікі прадпрыемстваў занялі чакальную пазіцыю, звальвалі ўсё на крызіс, не асвойвалі новую прадукцыю і не шукалі новыя рынкі збыту. А сельскай гаспадарцы ўвогуле ніякія крызісы не перашкода: прадукты заўсёды будуць карыстацца попытам, таму што людзям трэба есці.

Кіраўнік вобласці абвясціў **антыкрызісны план**. Па-першае, прадпрыемствам трэба аднавіць дакрызісныя аб'ёмы вытворчасці, каб не было прастояў, няпоўных працоўных тыдняў і скарачэнняў работнікаў. Другі пункт: новыя тэхналогіі і інавацыі, якія трэба шукаць і ўкараняць сумесна з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Па-трэцяе, нельга дапускаць затаваранасці складоў гатовай прадукцыі, каб не было вымывання абаротных сродкаў. Чацвёртае: неабходна скарачэнне вытворчых выдаткаў, што дасць магчымасць павысіць канкурэнтаздольнасць прадукцыі і павялічыць заробкі людзям. Гэтыя і іншыя захады дазволяць выканаць сёлета прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця і дастойна завяршыць пяцігодку.

Каб дасягнуць пастаўленых задач і павысіць якасць жыцця людзей, лічыць Пётр Руднік, трэба аб'яднаць высілкі выканаўчай і заканадаўчай улады. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама падзякаваў за працу дэпутатам: напярэдадні новыя выбары ў мясцовыя Саветы.

На завяршэнне сесіі пераможцы спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання атрымалі ўзнагароды. Лепшым у 2009 годзе ў Магілёўскай вобласці прызнаны **Верамейкаўскі сельскі Савет Чэрыкаўскага раёна**. Яго старшыня Віктар Іванькоў прыняў сцяг, а прэмія склала 500 базавых велічыняў. Другое і трэцяе месца занялі адпаведна Антонаўскі сельскі Савет Чавускага раёна (старшыня Таццяна Палявонак) і Беладубраўскі сельскі Савет Касцюковіцкага раёна (старшыня Міхаіл Грыбачоў).

Пераможцамі сярод органаў грамадскага самакіравання сталі **старшыня сельскага камітэта аграгарадка Бацвінаўка Крычаўскага раёна Ірына Капылова і савет мікразоны № 10 Кастрычніцкага раёна горада Магілёва, які ўзначальвае Людміла СТАРАСЦІНА**. Былі таксама адзначаны стараста аграгарадка Ціманава Клімавіцкага раёна Галіна Дамінікан, старшыня селькама вёскі Забруддзе Круглянскага раёна Надзея Прыльская, вулічны камітэт № 26 Ленінскага раёна Магілёва пад кіраўніцтвам Аляксандра Пікуля і цэнтр тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання № 5 Ленінскага раёна горада Бабруйска, кіруе якім Мікалай Сяліцкі.

**Ілона ІВАНОВА.**

# «НАДЗЕЯ» НАШАГА ДВАРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Часам жыхары таго ці іншага дома або мікрараёна збяруцца, вызначаць свае асноўныя праблемы, але справа далей не ідзе. Амаль усе чакаюць, што нехта прыйдзе і дасць грошы. Аднак даць атрымліваецца не заўсёды, іншая рэч — паўдзельнічаць у вырашэнні задачы разам. Бо практыка сапраўды сведчыць: калі людзі збіраюць частку сродкаў, рэшту заўсёды знойдзе той жа выканкам. Тым больш, што ў выканкаме будуць упэўненыя: чалавек, які даў прынамсі тысячу рублёў на ліхтар, ніколі яго не сапсуе.

— На гэты конт мая думка адназначная — тэрытарыяльнае грамадскае самакіраванне неабходна падтрымліваць, — лічыць **старшыня Брэсцкага аблсавета Сяргей АШМЯНЦАЎ**. — Напрыклад, вельмі распаўсюджанай з'явай і ў гарадах, і ў сельскай мясцовасці з'яўляецца індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Паўстае дом, каля яго ёсць участак зямлі, прылеглая тэрыторыя — і кожны іх даглядае. Аднак малюнак са шматпавярховікамі адрозніваецца. Па сутнасці, шматкватэрнікі — дамы таксама прыватныя. Але іх жыхары займацца добраўпарадкаваннем наваколля чамусьці не лічаць патрэбным. У выніку ж атрымліваюцца няроўныя ўмовы жыцця, а так быць не павінна.



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Дэпутат Баранавіцкага гарсавета Анатоль Банкевіч

## А грошы дзе?

Спадзявацца ва ўсім выключна на дзяржаву — наша звычка з савецкіх часоў.

Вось толькі ці павінна сталіца, вобласць і раён займацца клумбай або спартпляцоўкай каля кожнага канкрэтнага дома — ужо пытанне.

Што да адказу, то амаль ва ўсім свеце ён адзін. Ужо працяглы час у той жа Еўропе пераканаготаныя: лепш рабіць, а не чакаць. І меркаваць, што ў Беларусі ўдасца «вынайсці» нешта іншае, даволі наіўна.

Прычым даводзіцца канстатаваць: у нашай краіне ўжо распачаўся першы этап сумеснага беларуска-шведскага праекта «Павышэнне якасці кіравання органаў мясцовага кіравання і самакіравання на раённым і першасным узроўні». Адным з асноўных напрамкаў праекта, што будзе «выпрабаваны» ў Баранавічах, стане стварэнне пэўнай і да таго ж прыдатнай для ўсіх рэгіёнаў мадэлі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. А таксама распрацоўка прыкладнага палажэння аб ТГС. Безумоўна, такое палажэнне не можа быць «стандартным», бо паміж «хутарской» часткай Віцебшчыны, густанаселеным наваколлем сталіцы і «чарнобыльскай» часткай Гомельшчыны — розніца вельмі адчувальная. І тым не менш нельга недаацэньваць ролю падобнага дакумента. Палажэнне можа стаць своеасаблівым «штуршком» для развіцця новай справы.

— Акрамя таго, неабходна вызначыцца з крыніцамі фінансавання органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, — адзначае каардынатар праекта з беларускага боку, **загадчык сектара маніторынгу і аналізу сацыяльна-эканамічнага становішча Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Таццяна ВЯРЦІНСКАЯ**. — У гэтым выпадку можна ўзгадаць адлічэнні саміх грамадзян, бюджэтную падтрымку і спонсарскую дапамогу, але не толькі.

Патэнцыйны рэзерв — сродкі пазыковыя. А плюс да ўсяго, падаецца цікавай ідэя набыцця жыхарамі пэўнай тэрыторыі тэхнікі ці абсталявання з далейшым аказаннем тых або іншых паслуг (напрыклад, гаворка можа ісці аб міні-трактары для вывазу снегу). Зразумела, што органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — структуры не камерцыйныя. Аднак забараняць займацца пэўнай дзейнасцю, атрымліваць сродкі і каб накіроўваць гэтыя грошы на вырашэнне праблем з добраўпарадкаваннем — таксама няслушна.

— Актуальная тэма і стварэнне ў Беларусі асацыяцыі органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, — працягвае Таццяна Вярцінская. — З аднаго боку, асацыяцыя павінна зняць усе пытанні ўзаемадзеяння паміж такімі органамі, а з іншага — падтрымаць ініцыятывы грамадзян «знізу» ў юрыдычным і кансультацыйным плане. І недаацэньваць магчымасці такой падтрымкі нельга: часта вартыя задумы застаюцца на ўзроўні размоў толькі з-за недахопу інфармацыі, людзі не ведаюць, што і як можна зрабіць.

Між тым, не сакрэт: любыя памкненні могуць спыніць... адміністрацыйныя перашкоды. У сувязі з гэтым, паведаміла Таццяна Вярцінская, сумесны беларуска-шведскі праект будзе мець і такі напрамак, як распрацоўка «рэцэптаў» па дэбюракратызацыі органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Пры гэтым «пілотнай пляцоўкай» тут павінна стаць Віцебшчына, а дакладней, пасёлкі Бачэйкава і Обаль, горад Дзісна, а таксама вёска Перабродзе Мёрскага раёна.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Баранавічы — Мінск.*

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**
**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**
**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**
**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»**

**ГРАМАДСКІ САВЕТ:**
**НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
**БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
**АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
**СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
**ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
**МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

**АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:**
**Наталля КАРПЕНКА.**
*Кантактны тэлефон* **292 21 03.**

# МІСІЯ ДЛЯ СЯДЗІБЫ

Край раскрытых душ і дзвярэй
КОНКУРС «ЛЕПШАЯ СЯДЗІБА ГОДА»

# НА ПЕРШЫМ ПЛАНЕ — ДУША

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Я не атрымліваю пакуль што з гэтых сядзібаў адчувальных грошай у бюджэт, — кажа **старшыня Дакудаўскага сельскага Савета Аляксей ДЗЕМЯНОВІЧ.** — Не вырашае вясковы турызм і праблемы занятасці насельніцтва. Аднак менавіта з аграсядзібамі я звязваю спадзяванні аб адраджэнні Дакудава. Сёння мы, дзякуючы вясковаму турызму, удзельнічаем у міжнародных праектах па ўстойлівым развіцці, атрымліваем грошы на паляпшэнне экалогіі, пра нас ведаюць у Беларусі і за яе межамі. Тут сапраўды надзіва прыгожыя мясціны: Нёман, рыбалка, грыбы, журавіны... І пакуль да нас будуць ехаць людзі, вёска будзе жыць.

У Дакудаве розныя сядзібы — для розных турыстаў. Летась у конкурсе ўдзельнічала сядзіба Святланы і Юрыя Агаркаў «Дакудава». Яна стала пераможцам у намінацыі «Зялёная», што цалкам справядліва. Агаркі не толькі трымаюць уласную гаспадарку і агарод, жывуць у звычайным вясковым доме. Яны распрацавалі зялёныя маршруты, адукацыйныя праграмы, выгадавалі бусляня з пашкоджаным крылом. Цікава, што Агаркі наўмысна не спяшаюцца з пабудовай лазні, каб сама сабой адсейвалася катэгорыя турыстаў, якую больш цікавіць «лазнева-гарэлачная» праграма.

Сёлета ў конкурсе ўзяла ўдзел зусім іншая сядзіба — **«Ля парома»**. Намінацыя — *«Здаровы лад жыцця»*. Лазня на гэтай сядзібе — не простая, а двухпавярховая і... пяціспальная.

На жаль, нам не ўдалося пазнаёміцца з гаспадаром **Сяргеем Дубовікам**. У той самы момант, калі на сядзібу прыехала камісія рэспубліканскага конкурсу, ён атрымліваў дыплом з рук арганізатараў конкурсу абласнога. Затое нас, што паказальна, сустракаў старшыня сельскага Савета, што само па сабе ўжо сведчыць пра важны складнік поспеху вясковага турызму — супрацоўніцтва з мясцовымі ўладамі.

Цікава было б яшчэ больш даведацца пра аздараўленчыя мерапрыемствы (акрамя лазні), прапаганду здаровага ладу жыцця, уласныя рэцэпты прыгажосці... Ну пра ўсё, што датычыцца намінацыі, на перамогу ў якой сядзіба прэтэндуе. На жаль, тут паўтарылася тая ж сітуацыя, што і ў Мінскай вобласці (глядзі «Звязду» за 23 лютага). Ці то гаспадары не могуць паказаць, што робяць і маюць, ці то не лічаць патрэбным.

## ЗАХАВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ АДМЕТНАСЦЬ

Цікава, што здымкі з паездкі па Гродзеншчыне, якія на наступны дзень былі змешчаны на сайце WILDLIFE.BY (Дзікая прырода Беларусі), выклікалі цэлую палеміку вакол таго, як вясковыя сядзібы аформленыя і наколькі яны захоўваюць беларускія традыцыі. Нехта абвінавачваў гаспадароў у кічы: адсутнасці густу і страце пачуцця меры. Нехта — у падмане: нельга, маўляў, у інтэр'еры сумяшчаць корч і пластык, а экспазіцыю старажытных прадметаў побыту размяшчаць ля сцяны з лакіраванай вагонкай. Меркаванне, на маю думку, слушнае. Ёсць над чым падумаць і экспертам, і членам журы, і самім гаспадарам.

Сядзіба **«Над Нёманам»** (горад Бярозаўка) не з гэтага шэрагу. Хоць тут і спалучаюцца аўтэнтычныя старадаўнія рэчы з хуткасным інтэрнэтам. Гэта сядзіба летась заваявала гран-пры. Сёлета прэтэндуе на перамогу ў намінацыі *«Захаванне беларускіх традыцый»*. Я прыдумала б для гэтай сядзібы іншую намінацыю: «Стварэнне асаблівага сусвету».

Бо тое, што зрабілі **Аксана і Валерый Салькоўскія**, нельга назваць традыцыйна беларускім. Іх уласны дом пабудаваны ў баварскім стылі. Іх ландшафтны дызайн даволі сучасны. Гасцявы дом, хоць і перавезены з нейкай вёскі, але хату нагадвае толькі звонку. За апошні год яны пабудавалі яшчэ адзін, таксама з вясковага зрубу, але гэты і знешне ўжо вясковую хату не нагадвае. Самі гаспадары называюць яго «шале» або «зямлянкай». У першае верыш больш, чым у другое.

У Салькоўскіх усё настолькі прадумана да дробязяў, што становіцца трошкі не па сабе. Аднак хутка разумееш, што яны пагружаюць сваіх гасцей у асаблівы сусвет, магчыма, выдуманы, але разам з тым, у гэтым месцы і ў гэты час — рэальны. І прыгожы. А галоўнае — сагрэты іх адносінамі да кожнай з рэчаў, жывы.

Наколькі Салькоўскія і іх сядзіба захоўваюць менавіта беларускія традыцыі, гэта яшчэ пытанне. Але яны ствараюць нейкую новую беларускасць, сучасную, еўрапейскую, і ўсё ж такі ні на што іншае не падобную. Бо дзе яшчэ сустрэнеш вітражнае акно на бераг Нёмана? Альбо крупеню з белых грыбоў, ды з зуброўкай?

## СТВАРЫЦЬ ІНФРАСТРУКТУРУ

Сядзіба **«Хата магната»** (вёска Азёры) перамагла ў Гродзенскай вобласці ў намінацыі *«Стыль і гармонія»*. Але і тут нам не пашанцавала: **гаспадыня Ала Зайчанка** атрымоўвала дыплом у абласным цэнтры, ды яшчэ адначасова з намі прыехалі турысты.

— Вось дзяцей на снег вывезлі, — патлумачылі нам жыхары Гродна, нагадаўшы яшчэ пра адно прызначэнне вясковага турызму.

Аднак госці напружана чакалі, калі «камісія», нарэшце, з'едзе.




Гаспадары «Вераса» Ірына і Міхаіл МАКЕІ падказалі: вясковы турызм — гэта яшчэ і зараджэнне настроем і каханнем.

Дзеці тым часам качаліся ў снезе. Камісія спяшалася, але паспела ацаніць вялікі двор з выхадам на знакамітае возера Белае, і ўдала ўпісаную ў вясковую вуліцу аграсядзібу.

— Гэта няпростая задача для гаспадароў, — заўважыў **эксперт, доктар па архітэктуры Сяргей Сергачоў**. — Лягчэй нешта пабудаваць на пустым месцы, чым прыстасаваць для прыёму турыстаў тое, што ўжо існуе. Прычым так, каб і турыстам было хораша, і суседзі не раздражняліся.

Азёры — вялікая вёска, былое мястэчка, тэрыторыя ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння паблізу ад Гродна. Тут знаходзіцца вядомы санаторый, вакол — шматлікія летнікі, базы адпачынку. Аграсядзіба — вельмі лагічнае і запатрабаванае дапаўненне да ўсяго гэтага. Асабліва цяпер, калі ёсць магчымасць набываць у санаторыі курсоўкі.



Сядзіба «Ля парома»: падобныя экспазіцыі ёсць амаль усюды. Важна, напэўна, не проста іх сабраць, але і ўдыхнуць у гэтыя рэчы жыццё.



«Дзяцей на снег вывезлі», — проста патлумачылі госці ў сядзібе «Хата магната». Ужо за адно гэта вясковаму турызму «дзякуй».

І ўсё быццам бы добра. Але засталося адчуванне, што паток турыстаў сюды настолькі вялікі і яны такія непатрабавальныя, што гаспадары альбо не паспяваюць, альбо ўжо і не імкнуцца стварыць уражанне, што ты тут дарагі і доўгачаканы госць.

## НАБЛІЗІЦЬ ДА ПРЫРОДЫ

**Пётр Сіняпкін**, гаспадар сядзібы **«Трычоўскі маёнтак»** (вёска Трычы), да нашага прыезду паспеў не толькі атрымаць дыплом ад абласнога начальства, але і павесіць яго на сценку. Не дзіва, што гаспадыня не заўважыла — калі. Бо яна напякла да прыезду гасцей піражкоў і піражных, накрыла стол. Але госці ад астатняга адмовіліся: аб'ехаць за адзін дзень пяць сядзібаў і есці ў кожнай немагчыма. Не змаглі адмовіцца яшчэ толькі ад казінага малака і сыраквашы. Дзе яшчэ такое пакаштуеш?

Сядзіба пакінула глыбокае ўражанне. Гэта пры тым, што камісія ўжо шмат пабачыла. Усё ж такі галоўнае, падумалася, каб гаспадары ўмелі дарыць сябе саміх. Не прапаноўваць толькі месца. Не ствараць антураж. Не карыстацца толькі тым, што дорыць прырода. Але менавіта дарыць сябе людзям. Свой светапогляд. Сваю філасофію. Сваё стаўленне да жыцця.

Пётр Сіняпкін умудрыўся за нейкую гадзіну падарыць нам сваю любімую кабылу Фаціму, а таксама сваю любімую ламу, свайго любімага фазана, і любімага паўліна, і любімага страуса... Усё гэта, а таксама пяць катоў, два сабакі, рыбкі, камін па аўтарскім праекце, драўляны прасторны дом на месцы былой звалкі, лес, у якім апошнія госці любілі гуляць ноччу, па снезе... Усё гэта мы павезлі дадому, у пасыпаны пяском і соллю Мінск. Насельнікі Трычоўскага маёнтка і сам гэты дзіўны дом засталіся з намі. Як і жаданне вярнуцца, каб паглядзець, як паўлін распусціць свой шыкоўны хвост, увесну...

Намінацыя, на перамогу ў якой прэтэндуе Пётр Сіняпкін, цалкам адпавядае гэтай сядзібе — *«Зялёная»*. Там нават лямпачкі ўсюды эканамічныя.

## ПАДАРЫЦЬ УРАЖАННІ

Гэту задачу паспяхова выконваюць многія сядзібы. Але гаспадар **«Вераса»** (вёска Казловічы) дзеля яе нават карабель на сваёй тэрыторыі пабудаваў. Сапраўдны — толькі што не плавае. Дэкарацыі да нейкага фільма. Затое можна дзецям бегаць па палубе і гуляць у піратаў, а дарослым — фатаграфавацца, піць каву і любавацца домам і садам.

Пра гэту сядзібу «Звязда» таксама пісала ўжо, год таму. Сёлета яна намінаваная на званне *«Гасціннасць»*. Што ж, **Ірына і Міхаіл Макеі** чакалі экспертную камісію ўвесь дзень. І тым не менш яны ні словам не папракнулі, нават выгляду не падалі, хоць мы і спазніліся гадзін так на пяць. Усміхаліся гэтак жа шчыра і цёпла, як і год таму. Акрамя таго, наладзілі некалькі змен страў, у тым ліку дэсерт з уласных клубніц і парэчкі. І на іх дваіх, як заўсёды, прыемна было глядзець. Вясковы турызм — гэта яшчэ і зараджэнне настроем і каханнем. Жаданнем захоўваць моцную і дружную сям'ю. Якой усё пад сілу: і дом, і бізнэс, і шчасце.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Марына БЕГУНКОВА (фота),**
*Гродзенская вобласць.*



Коней з «Трычоўскага маёнтка» з сабой не забярэш, а незабыўныя ўражанні — калі ласка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Увогуле амаль усе сядзібы, бы наўмысна ведаючы жаданні турыстаў галяком кінуцца ў рэчку, будавалі свае лазні непадалёк ад вады.

— На мой погляд, мы павінны перагледзець крытэрыі журы, — разважае **Алесь Лозка**. — Атрымліваецца, што некаторыя пункты толькі ў адной намінацыі, а што — астатнія сядзібы нездаровага ладу? Таму неабходна выбраць агульныя пункты-крытэрыі. Традыцыйны ўхіл павінен быць у кожнай сядзібе: паслугі, забавы, адпачынак.

## «Гасцінныя» і «гарманічныя»

Вы ведаеце, як можна ацаніць гасціннасць? Колькі чарак табе налілі ці колькі падушак паклалі перад сном пад галаву?

У **Тарэсы Анашкевіч з сядзібы «Каля возера», што ў Глыбоцкім раёне**, свой сакрэт: хлеб-соль для гасцей і адкрытае сэрца. На ўваходзе нас чакала не толькі гаспадыня ў фартуху і з караваем, але і снегавік, стылізаваны пад беларускую маладзіцу.

— Калі я пайшла на пенсію, наш Глыбоцкі выканкам прапанаваў зрабіць наш дом гасцінным домам для адпачынку ў вёсцы, — распачала аповед **Тарэса Анашкевіч**. — Мы з мужам пагадзіліся. Муж у мяне малайчына, толькі цяпер захварэў, а трымаць сядзібу без мужчыны цяжка, таму выбачайце за няпаленую печ.

Экспанатаў у спадарыні Тарэсы не так шмат, як у Фурсаў ці Маслаў, але нават пра гэтыя прадметы яна распавядае з задавальненнем:

— Стол з арэшніку. Усё зроблена рукамі дзядулі і бацькі майго мужа. Гэты ручнік — саматканы. Гэта кубялок — для захоўвання збожжа, ён плецены з лазы. Гэта — качалка для прасавання бялізны. А гэта старадаўні млынок, пасённяшняму кавамолка. Гэта капылкі...

Радуе, што выстаўленыя на экспазіцыю гэтыя экспанаты не збіраюць пылу, як у многіх іншых сядзібах, а здольныя ажываць у руках гаспадыні.

Пані Тарэса паказала нам з дзясятак экспанатаў, расказваючы пра кожны з цеплынёй і пяшчотай. І сказаць па шчырасці, задавальнення ад яе аповедаў я атрымаў нашмат больш, чым ад простага сузірання за жалезнымі цмокамі гаспадара Маслы. У сядзібе Анашкевічаў лазня, бадай, лепшая з усіх, якія я бачыў за гэтыя дні. Высокая, у меру прасторная і ў нечым нават родная. Гасціннасць сядзібы напрамую залежыць ад гасціннасці гаспадароў. Спадарыня Анашкевіч гэта даказала.

— Тэндэнцыя да з'яўлення зусім розных паміж сабой сядзібаў, якія ў Беларусі растуць як грыбы пасля дажджу, станоўчая, — дзеліцца развагамі **эксперт, аглядальнік часопіса «Дзікая прырода» Надзея Суслава**. — Зразумела, сядзібы нельга ацэньваць на адзін капыл. Нашай экспертнай камісіі варта падумаць над тым, каб намінацый было больш. Агратурызм — кірунак, які дае дадатковы прыбытак, які прымушае людзей крэатыўна думаць. На сённяшні дзень робіцца вялікая праца, прыемна асэнсоўваць, што людзі гэтым займаюцца з душой.

Сваю душу ў сядзібу ўклаў і **Анатоль Пігулеўскі з сядзібы «Панскі сад» у Мазырскім раёне**. Толькі душэўнасць гэтая вылілася пераважна ў матэрыяльны бок. Прызнаюся, не вельмі мяне ўзрушыла трохпавярховая сядзіба, перад якой былі прыпаркаваныя сем здаровых джыпаў гасцей сядзібы. Калі ў такі «Панскі сад» на «Масквічы» прыедзе мая мама, ёй там можа быць няёмка. Більярд і караоке, пагадзіцеся, былі не зусім характэрныя для побыту беларусаў пачатку мінулага стагоддзя. Але кожнаму сваё. І на такую сядзібу, як паказвае практыка, попыт ёсць.

— Аграэкатурызм — вельмі добрая перспектыва, — упэўненая **спявачка і кіраўнік «Святочнага агенцтва Ларысы Грыбалёвай» Ларыса Грыбалёва**. — Трэба толькі больш яго рэкламаваць. Яго патрэбна прыгожа афармляць, падказваць. Для сям'і больш падыдуць маленькія сядзібы, дзе было б утульна адпачыць на выхадныя. Калі ж на адпачынак прыязджае група кітайцаў, скажам, то ім патрэбна не толькі шмат месца, але і пэўная культурная праграма. Часам сядзібам не хапае лоску, каб прывесці туды кліентаў. Кліент розны — кожнаму патрэбна нешта сваё. А малюнкі, якія ілюструюць 282 сядзібы ў буклеце, не перададуць сапраўднай атмасферы, пакуль не пабачыш сам. Я гляджу на сядзібы вачыма спажыўца: куды б наважылася паехаць я. У адну сядзібу я магла б прыехаць з сябрамі, у другую — з дзецьмі. Па-мойму, варта задумацца над тым, чым павінна стаць для вас сядзіба, гэта хобі альбо бізнэс. Калі гэта бізнэс, то ім трэба займацца кожны дзень. Сёння колькасць сядзібаў імкліва расце. Я раіла б надзяляць больш увагі якасці, а не колькасці.

* * *

**Ад аўтара:** *Зялёнае святло гарыць. Сядзібны бізнэс расце як грыбы. Любы беларус пры жаданні можа стварыць сёння сваю «гасцінную», «зялёную», «гарманічную», «здаровую» ці «з беларускімі традыцыямі» сядзібу. Былі б толькі наведвальнікі. Нездарма ў некаторых намінацыях гэты крытэрый фігуруе як прыярытэтны. У тых сядзібах, дзе з экспертамі пабываў я, сітуацыя розная. У адных — латышы, немцы, палякі — частыя госці. У іншых — толькі час ад часу спыняюцца беларусы. Адпачыць у Беларусі можна. І колькасць сядзібаў, дзякаваць богу, дазваляе адпачынак выбраць: сямейны, карпаратыўны ці індывідуальны. Так што цяпер справа за намі.*

**Ільля ЛАПАТО, фота аўтара.**

### СЛОВА АРГАНІЗАТАРАМ КОНКУРСУ:

**Марыя БАРЫНАВА, спецыяліст па турызме, кансультант БГА «Адпачынак у вёсцы»:**

— Наша арганізацыя — першая, якая пачала займацца развіццём і папулярызацыяй вясковага турызму ў Беларусі. Пры яе ўдзеле быў створаны Указ № 372 «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму», згодна з якім людзі займаюцца аграэкатурызмам без падаткаабкладання. Выкарыстоўваючы вопыт еўрапейскага турызму, для гаспадароў беларускіх сядзібаў мы ладзім спецыяльныя семінары. Радуе таксама той факт, што ўсё больш агратурызмам пачынае займацца і моладзь.

**Святлана КОНЧЫЦ, начальнік упраўлення карпаратыўнага бізнэсу ААТ «Белаграпрамбанк»:**

— Цяпер рыхтуюцца змяненні ва Указе, згодна з якім ільготы будуць працягнуты яшчэ на 10 гадоў. Налета плануем дадаць новыя намінацыі. Таму што некаторыя з сядзібаў не зусім упісваюцца ў тыя крытэрыі, па якіх вызначаюцца пераможцы. Але адзначыць іх проста немагчыма. Бізнэс — другаснае, на першым плане — душа. Перад журы стаіць цяжкая задача, з лепшых выбраць найлепшых. Хутчэй за ўсё, тэрміны агледзін сядзібаў у наступным годзе будуць змешчаныя на лета-восень, каб у поўным аб'ёме прасачыць іх прыгажосць.



Майстар-клас ад каваля Юрася ФУРСА. Намінацыя — «Захаванне беларускіх традыцый».

**Кнігарня — ці не адзіная з крамаў, дзе жыў бы і жыў, як кажуць!**
**Але не ў той дзень... У той — ну хіба што спехам: забегчы — купіць паштоўкі (да дня «не святой Валянціны») і ўсё. Выбар вялікі — вочы разбягаюцца, і спыняюцца — на дзвюх крапальна-пяшчотных жырафах — вялікай і трохі меншай. З надпісам: «Ты і я».**

# ТЫ І Я. МЫ...

### Каля пліты

Нехта цікаўны злічыў, колькі, прыкладна, часу (за жыццё) жанчына траціць на тое, каб знайсці нешта ў сумачцы.

Можа, злічаць калі і тое, колькі (месяцаў? тыдняў?) яна ж глядзіць у... патэльню.

...Цяпер там сырнікі. «Пасу», гэта значыць, сачу за тым, каб прапякліся і не падгарэлі, каб была скарыначка — прычым пэўнага колеру — для чаго час ад часу кідаюся да іх з відэльцам...

І, прыпадымаючы (рана, марна...) міжволі ўспамінаю мудрае... Паніч адзін (а ўжо малады, прыгожы) у сямейку вартую трапіў. На выданне там — аж трое дзяўчат. «Выбірай, — кажа бацька, — любую аддам». Хлопец ведае нават, каторую: вока выбрала ўжо! Але іншых крыўдзіць таксама не хочацца... Што ж рабіць? Падумаў ды і кажа: «Хай кожная з дзяўчат паставіць на пліту па чайніку. У якой з іх першым закіпіць, з той і пабяромся».

Пытанне на засыпку (для тых, хто не ведае): дык каторую ж ён узяў?

Адказ: самую малодшую. Таму што дзвюм старэйшым вельмі карцела замуж: яны ўвесь час мітусіліся, нерваваліся, падымалі накрыўку, каб паглядзець (кіпіць-не кіпіць?) і тым самым — выпускалі цяпло.

А малодшая была спакойнай.

Што важна, як высвятляецца — нават ля патэльні.

### Двое

...З Ванем мы знаёмыя даўно, сустракаемся часта і размаўляем тады пра ўсё. Адзінае — ён ніколі, нічога не казаў пра жонку... Ну хіба незнарок? Што дачку калісь назваць хацеў Васілінай, Васілінкай, як нябожчыцу-маці. А яна не дазволіла. Што гадоў з пяць таму разам рашылі абнавіць кватэру. Разам выбралі дзверы — з натуральнай вольхі, са шклом. А замовіла жонка адна — зусім іншыя. Ёй спадабалася, што гэта — танней, да таго ж — з дастаўкай-устаноўкай. Дата яе ў паперах была запісана (умоўна — 20 снежня). Таму ён напярэдадні ўсе старыя дзверы (у тым ліку ў ванну, кухню і прыбіральню) паздымаў і завёз на дачу. Новыя ім прывезлі... толькі пасля святаў. А ўсё Навагоддзе...

На тыя ж граблі летась наступілі яшчэ раз, калі на заказ рашылі зрабіць мэблю для кухні. Ён апытаў досыць сур'ёзную фірму, да іх прыязджаў дызайнер — разам яны малявалі эскізы, разам лічылі кошт і суму задатку. А праз тыдзень жонка знайшла гатовы набор — па аб'яве на слупе, тут жа «праплаціла» і ўвечары ёй прывезлі...

Мужу заставалася зняць старыя шафкі і вывезці на лецішча, а новыя — павесіць-паставіць. Як гэта ні цяжка было, бо новая мэбля выглядала куды горш, чым тая, што звёз. Да таго ж чыста функцыянальна была вельмі нязручнай.

Затое — таннейшай!..

І каб грошай не было! А то...

З Ванем мы знаёмыя даўно, сустракаемся часта і размаўляем тады пра ўсё. Адзінае — ён ніколі, нічога не кажа пра жонку.

Але нават таго, што сказаў, ужо дастаткова, каб ведаць, чаму па вечарах ён так позна сядзіць на працы, чаму так ахвотна з'язджае ў камандзіроўкі — нават за блізкі свет, у суботу-нядзелю...

Не хочацца ісці дамоў, дзе з табою не вельмі лічацца. А значыць — не паважаюць?

### Што да чаго

...З нявесткай суседзі рашылі жыць дружна. Чаго б ні каштавала!

Хоць каштавала шмат: каля трох тысяч долараў аддалі, каб зняць маладым асобнае жытло (на год. А далей мо неяк самі?..), каб абставіць самым неабходным, каб сказаць «жывіце» і потым — не назаляць, заходзіць — хіба што зрэдку...

І кожны раз з трывогай заўважаць, што ў хаце, мякка кажучы, не прыбрана, што халадзільнік пусты...

Але яны маўчалі (раней) і маўчаць цяпер... Хоць гэта і цяжка...

Трэцяга дня вось бацька не вытрымаў — над канапай у іх згледзеў узорыстую сетку з павуціны, пачухаў патыліцу, сказаў: «Хто яго ведае, можа гэта і прыемна — прачнуцца раніцай і такі вось «шэдэўр» над сабою ўбачыць? Ці, засынаючы, аўтара...»

— Да!.. Да! Ну, конечно! — тут жа залапатала нявестка. — Это действительно очень приятно, очень интересно!.. И знаете, я читала в толстых журналах, что паучки, паутина — это к деньгам...

А свёкру са свекрывёй здаецца — да разводу. І добра б можа цяпер — пакуль малечы няма, пакуль яна, як у тым анекдоце, не сказала: «Мама, а давай у хаце прыбяром. Дзе наш пыласос?» І не пачула: «Ідзіце па сцяжынцы...».



### Трое ў лодцы

...Нічога (у сэнсе пярсцёнкаў, бранзалетаў, гадзіннікаў) не нашу на руках: жыву без... Хоць зрэдчас і кажу сабе, што так вось — нельга, трэба, як людзі, як нармальныя жанчыны. І тады нешта дастаю з адмысловай каробачкі — каб адзець, на тыдзень ці дзень...

— Ой, ты замуж выйшла? Віншую!.. — у адзін з такіх, згледзеўшы штосьць на пальцы, лапоча шапачная знаёмая. — І хто ж у вас на вёслах?

Сказаць (у тым ліку), што выйшла даўным-даўно, што ў нас дэмакратыя, я не паспяваю. Ды яна і не чакае: больш, чым лёгкая на язык, лапоча сама, што вось іхняй лодкай «рулюе» яна: як скажа, то так і будзе! Ва ўсім...

Як кажа і што з гэтага атрымліваецца, пры рэдкіх сустрэчах расказвае сама, даносяць знаёмыя, што човен іх, лёгка мяняе напрамкі: гэта значыць, «фірмы», дзе працуюць абое («бо трэба ж шукаць, дзе плацяць»?..) і прыватныя кватэры, дзе жывуць. Разам з імі, тымі кватэрамі, як пальчаткі мяняюцца — дзіцячыя садкі і школкі, куды ходзіць дачка («другое дзіця? Ды крый Божа!»), пазычаюцца значныя сумы грошай — у радні, у сяброў — і... не аддаюцца па прычынах больш, чым «уважлівых»: кшталту — у іх жа ўсё ёсць, навошта ім грошы, а нам — трэба... Вось атрымаем кватэру, купім машыну...

Атрымалі... Купілі...

Па апошніх звестках (дай Бог не праўдзівых!) мужа ў камандзіркі не стала, дачка (тая адзіная) вырасла, мякка кажучы, зусім не такой, як хацела маці.

Ні радні, ні сяброў няма...

### Адхапіла

...Вяселле тое, як быццам учора было! Бо дужа ж гучнае!.. І ў ну вельмі прыгожай пары — абое высокія, стройныя... Асабліва ён — ну вачэй не адвесці.

— Шчаслівая, — услых зайздросціла маладой адна з яе шаферак (астатнія ўпотай). — Такога волата адхапіла! Такога прыгажунчыка кожны дзень будзе бачыць!

І не бяды, здавалася, што ён, той волат, як свіння напіўся — на сваім жа вяселлі.

...Было яно гадоў -наццаць назад.

Тых маладых і прыгожых цяпер не пазнаць. Таму што ў яго атэрасклероз, псарыяз, язва, стэнакардыя. І ці не самае страшнае — алкагалізм: каторы год ужо нідзе не працуе.

Што яна? Развялася. Даўно. Але размяняць кватэру, неяк раз'ехацца так і не змагла. Таму па-ранейшаму кожны дзень мае «шчасце» бачыць — «волата».

Вось такога.

### Па ламінаце

...Установа, доўгі калідор — з дзясяткамі новых дзвярэй і крэслаў для «чакальнікаў», з новым ламінатам на падлозе. Ён светлы, ён бездакорна гладкі, бліскучы — ён ну ўсім, здаецца, харошы, пакуль...

Пакуль на яго, з нейкага кабінеціка, не выносіць лёгкую маладзічку на высокіх абцасах. Яна грукоча імі так, — ну ўсе вочы там: на зграбнай фігурцы ў шэранькім строгім касцюме, на хударлявым вастраносым тварыку, на (хай прабачыцца) тонкіх крывенькіх ножках. Такія жанчыны зазвычай хаваюць — пад нагавічкамі, пад доўгімі спадніцамі. Гэта — не, дэманструе. Маўляў, што ёсць, то ёсць! І «насіцца» павінна з форсам!

(У тыя імгненні — пад анекдот: «Харошая ў цябе жонка, — зайздросціць адзін вясковец другому. — Вось толькі ногі крывыя». «Такой бяды, — пасміхаецца ён, — добра будзе... На працу хадзіць»).

А куды яшчэ?

### Пачатак і канец

Той «ліст» (таўшчынёй... сантыметраў з пяць) сустракала з жахам (як жа яго прачытаць?), — аказалася — лёгка, з радасцю: вучань 9-га класа (не так важна, якой школы) напісаў гісторыю жыцця сваёй сям'і — дзядоў, прадзедаў, прапрадзедаў. Само сабою — бацькоў.

Два ўрыўкі адтуль: «...Новая старонка майго радаводу — дзядзечка Міця. Ён працуе ў саўгасе. У яго вялікі жоўты трактар, які я магу адрозніць нават па гуку. Ён працуе на ім 15 гадоў без капітальнага рамонту... Аднойчы я бачыў, як сам галоўны інжынер па сельгасмашынах усяго раёна з дзядзькам Міцем вітаўся за руку. Мне было прыемна, што яго ведаюць і паважаюць на працы.

І ў доме ў нас з яго прыходам многае змянілася. Усюды адчуваецца сапраўдная мужчынская рука. Куды ні глянь — нешта прыемнае ад дзядзькі Міці.

Змянілася і мамачка. Яна ажно свеціцца шчасцем. Такой я яе ніколі не бачыў. Яны так любяць адно аднаго! Шкада толькі, што сустрэліся гэтак позна. Калі абаім па 40 гадоў. Але ж наперадзе можа быць яшчэ столькі!

Хай жа яны будуць шчаслівыя!

Нам з братам дзядзька Міця спадабаўся адразу. Цяпер мы адчуваем, што ў нас ёсць бацька. Так хочацца і назваць яго тата, але нешта стрымлівае. Што — не ведаю. Ведаю адно — татам я лічу яго, бо не той бацька, хто нарадзіў, а той, хто гадуе.

Які ж я шчаслівы, што ў мяне ёсць цяпер бацька, што ёсць каму прыйсці на бацькоўскі сход, і што на мой выпускны прыйдуць мама і тата, як ва ўсіх дзяцей, што нас ёсць каму пакатаць на трактары, павучыць вадзіць машыну, падказаць, дапамагчы...

Я люблю цябе, дзядзька Міця».

У іншым месцы: «Апошнім часам адбыліся сумныя падзеі: памёр наш любімы дзядулька... А ў канцы жніўня нас пакінуў дзядзька Міця. Зялёны змей мацней за нашу любоў да яго».

І (дадамо...) за павагу — людзей (у тым ліку — «самага галоўнага інжынера па сельгасмашынах»...

За 40 гадоў жыцця (з безліччу вялікіх і малых радасцяў), якое магло (!) быць.

### Што важна...

Панядзелак (аўторак, серада...). Раніца. Чалавек (у сэнсе муж) сыходзіць на працу. Жонка сядзіць дома, гэта значыць, нешта гатуе, уключае пральную машыну, будзіць дзяцей, корміць, адпраўляе, прыбірае, прасуе...

І «паралельна» думае, што вось ён цяпер ужо дайшоў да прыпынку, у трамваі (калі пашчасціла сесці) пачытаў, пабачыў людзей (магчыма — знаёмых), на месцы — з добрай сотняй павітаўся, нешта пачуў, сказаў, зрабіў... Ён — безумоўна ж, важнае, істотнае, патрэбнае. Яна?

## Простая мова

Дзень да вечара (і каторы ўжо?!) ціха пратупала, пратапталася па хаце. Каб потым кожнаму з сямейнікаў (калі б ён ні прыйшоў) адчыніць дзверы, каб кожнага (ці ўсіх) пасадзіць за стол, пакласці ў чыстую пасцель...

І дай Бог ніколі не пачуць, як муж, сабраўшыся з сябрамі, услых разважае, што без жанчын (і жонак!) яно, у прынцыпе, ну ніяк... Бо (у тым ліку) дзеці... Але і з імі, блін!.. Бо такія тупыя!..

Не вашымі «малітвамі»?

### Ты і я. Мы

Двое — у ложку. Яна (не зусім здаровая) пытае:

— Слухай, а калі я памру, ты ж ажэнішся?

— Ну напэўна...

— І што — тая другая будзе ляжаць вось на гэтым месцы?!

— Ну... Не выкідваць жа ложак...

— І павесіць на сцяне сваё фота?

— Ну... Калі захоча.

— І будзе насіць маё футра, ездзіць па горадзе на маёй машыне?!

— Не... У яе правоў няма.

Гэта — анекдот. Зараз — быль.

Любаня ў той год хварэла — часта і цяжка: з бальніц не вылазіла. Але шторы новыя шыла: купіла тканіну, у нейкі вечар скроіла, выцягнула старую бабуліну машынку, узялася страчыць і ледзьве не кінула — строчка выходзіла нейкая няроўная, неахайная.

— Во, — паскардзілася мужу, — памру, ты новую ў дом прывядзеш... Паглядзіць і скажа: «Ну, што ў цябе за жонка была — шторы і тыя падрубіць не ўмела!».

Муж усміхнуўся ёй, пагладзіў па руцэ:

— А я ёй скажу, што вось гэта — адзіны недахоп твой быў, адзіная хіба.

...З гэтым, згадзіцеся, неяк лягчэй жыць.

І нават паміраць.

**Валянціна ДОЎНАР.**



Дзённік бландзінкі

## МАЎЧАННЕ ЯК ВЫКЛІК

Пярэрванае маўчанне — адзін з вельмі распаўсюджаных казачных сюжэтаў.

Згадайце — герой можа атрымаць нешта важнае для яго, але толькі з умовай, што ён не будзе гаварыць нейкі час. Здавалася б, што прасцей? Але ж не!

Помню, у дзяцінстве ў мяне была нейкая паўнавуковая кніжка з казкамі, здаецца, Тыбета... Жудасная ўводка: чалавек ідзе па мясцовасці, і тут да яго прыстае мярцвяк, які, пагражаючы герою смерцю, патрабуе данесці яго труп да нейкага дрэва, каб прывязаць у мяшку... А дрэваў у той мясцовасці нямнога, таму трэба ісці далёка, ды яшчэ з умовай не гаварыць ні слова. Пры гэтым мярцвяк пачынае расказваць казку, а чалавек не павінен нічога прамаўляць, іначай вымушаны вярнуцца ў зыходны пункт. І што вы думаеце — гэты ср...ны мярцвяк кожнага разу правакаваў чалавека на якую-небудзь рэакцыю! І яны нахадзілі на цэлую кніжку казак...

Якія нявытрыманыя людзі, думаеш сам пра сябе. Ужо ты б адназначна ўтрымаўся, асабліва калі ёсць пагроза твайму жыццю. Але аднойчы ты страчваеш голас і разумееш — справа не ў тваёй рашучасці гаварыць ці не гаварыць, а ў тым, як да цябе ставяцца людзі. Праблема маўчання — гэта пытанне даверу ці недаверу.

Ты страчваеш голас і пішаш блізкім людзям запіскі — не пытайце мяне ні пра што, бо калі мучаць прасеўшыя галасавыя звязкі, то справа можа скончыцца кепска, у горшым выпадку хірургічным умяшаннем... Але твой зварот толькі правакуе новыя пытанні ці эмоцыі. Цябе як быццам шкадуюць, але прадаўжаюць правакаваць парушыць маўчанне — жэстамі, мімікай, нечаканымі пытаннямі. Ты пішаш і пішаш звароты «Не гаварыце са мной», а людзі ацэньваюць гэта як істэрыку ці лёгкае вар'яцтва. Ім здаецца, што яны абавязкова павінны выказаць сваё шкадаванне ўголас, разам з версіямі, чаму ты маўчыш.

Мучаешся, але прыходзіш да нечаканай высновы. Любоў — гэта ступень даверу. Калі чалавек любіць цябе — ён слепа і безагаворачна табе давярае. А гэта значыць, што ў тваёй сітуацыі «маўчанне альбо смерць» ён і для сябе выбера маўчанне.

## ПРА ЭСКІМОСАЎ

У маёй сяброўкі — культурны шок. Яна рэдагуе кулінарную кнігу. Дакладней, падручнік па кулінарыі для дзяцей з адхіленнямі развіцця, прычым на беларускай мове.

Так як мне даводзілася чытаць падручнікі па гатаванні, я з веданнем справы спытала:

— Ну што, пункт нумар адзін — мыццё рук?

І ў яблычак! Аказалася, што напамін пра рукі ўзбагачаны ўдакладненнем пра неабходнасць вычышчаць бруд з-пад пазногцяў, бо менавіта там селяцца глісты. Што тут скажаш, bone appetite!

Але цікава тое, што большасць кулінарных тэрмінаў, тыпу пасіроўкі, маёй сяброўцы былі незнаёмыя. Спачатку мяне гэта здзівіла, але пасля згадала: я і сама іх ведаю выпадкова...

Па той прычыне, што ўсё сваё дзяцінства гартала і чытала культавае савецкае выданне «Кніга пра смачную і карысную ежу». Больш за тое, калі да нас у госці прыходзілі мае сяброўкі, яны таксама з задавальненнем гарталі менавіта гэтую кнігу. Прытым, што ў хаце было шмат мастацкіх альбомаў, у тым ліку і модны тады Бідструп. Але гарталі менавіта яе, любуючыся карцінкамі неіснуючых, як нам здавалася, прадуктаў — чорнай ікры, языка ў жэле, сяўругі...

Толькі цяпер зразумела, адкуль мая цікавасць да кулінарыі — я спрабую ўвасобіць тое, што ў дзіцячыя гады было для мяне толькі карцінкай, знакам без змесціва.

Неверагодна, колькі прадуктаў было ў маім дзяцінстве такім «пустым знакам»... Напрыклад, згадваю, як мая сяброўка абуралася тэкстам песні, якую мы ўсе тады проста ненавідзелі:

*Прилетит вдруг волшебник*
*В голубом вертолете*
*И бесплатно покажет кино.*
*С днем рожденья поздравит*
*И, наверно, оставит*
*Мне в подарок пятьсот эскимо...*

Гумар у тым, што ў маім дзяцінстве ўжо былі тэлевізары, і кіно можна было глядзець абсалютна бясплатна хоць цэлы дзень.

Зноў жа, што такое «эскімо», мала сабе хто ўяўляў. Бо якраз у маім дзяцінстве ўласна эскімо ў выглядзе цыліндра ўжо не было. Быў пламбір у шакаладзе на палачцы, але ён быў не цыліндрычным, а плоскім, і слова «эскімо» на ім не напісанае... Дык мая сяброўка лічыла, што пад словам эскімо маюць на ўвазе эскімосаў, жыхароў Поўначы. Паколькі маё ранняе дзяцінства праходзіла ў Маскве, дзе гэты гатунак марозіва ніколі не пераводзіўся, я спрабавала расказаць, што гэта і як выглядае. Але марна!

Песня так і засталася для яе суцэльным здзекам — чараўнік паказвае нешта непатрэбнае і пакідае ў падарунак нейкіх эскімосаў у колькасці 500 штук...

Прызнацца, ніколі не сустракала людзей, якія б любілі песню пра блакітны верталёт. Але вось што цікава, я пастаянна бачу людзей, якія чакаюць цуда, нават і не думаючы што-небудзь зрабіць для яго набліжэння.

Неверагодна, колькі людзей за апошні час гавораць мне сказы кшталту: «Эх, прыйшоў бы да мяне «Дачны адказ», пасадзіў бы кветкі на дачы!» Ці: «Ты не ведаеш, а ў наш горад прыязджае «Кватэрнае пытанне», калі ім напісаць? А то трэба шпалеры паклеіць...»

У людзей пастаяннае ўражанне, што ім зараз пазвоняць у дзверы і скажуць: «Вы выйгралі ў латарэю!» Хоць яны не парупіліся нават квітка купіць...

Адзінкі спрабуюць зрабіць нешта, каб свет вакол іх стаў больш гарманічным. Астатнія праводзяць час у бясплотных марах, у чаканні чараўніка і пяцісот эскімосаў, якія зараз прыйдуць і вырашаць усе пытанні — культурныя, эканамічныя, матрыманіяльныя...

## СЭЛІНДЖЭР І БЕЛАРУСКАЯ АДУКАЦЫЯ

Гады тры таму прысутнічала пры размове маладых людзей шаснаццаці гадоў. Хлопец-беларус пытаецца ў дзяўчыны-амерыканкі:

— А ты любіш Сэлінджэра?

— А я яго не чытала...

— Слухай, дык яго ж нават у беларускай школе вывучаюць!

— А я не выбірала літаратуру ў якасці прадмета вывучэння...

У мяне тады быў шок, але прыемны — хоць нейкія перавагі ў нашай сістэме адукацыі!

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

## А ЛАСЁЎ СТРАЛЯЮЦЬ

**У Пружанскі РАУС звярнуўся галоўны паляўніцтвазнавец ГЛГУ «Пружанскі лясгас». Каля в. Бярозаўка невядомы браканьер застрэліў двух ласёў.**

Страты, нанесеныя прыродзе, дасягаюць 12 млн 650 тыс. рублёў. Заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


## ОАО «БЕЛХОЗТОРГ»

*220005, г. Минск, ул. Платонова, 34*

Основной вид деятельности: **оптовая торговля**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

*млн. руб.*

| АКТИВ | На начало отчетного года | На конец отчетного года |
|---|---|---|
| Внеоборотные активы | 26955 | 27179 |
| Оборотные активы | 7508 | 10491 |
| Баланс | 34463 | 37670 |
| **ПАССИВ** | | |
| Источники собственных средств | 28944 | 29827 |
| Доходы и расходы | | |
| Расчеты | 5519 | 7843 |
| Баланс | 34463 | 37670 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| Наименование показателей | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | 44354 | 37339 |
| Себестоимость реализованных товаров, работ, услуг | 31332 | 27354 |
| Расходы на реализацию | 10340 | 8579 |
| Прибыль (убыток) от реализации | 2682 | 1406 |
| Прибыль (убыток) от оперативных доходов и расходов | 5 | 1 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 47 | 107 |
| Прибыль (убыток) за отчетный период | 2734 | 1514 |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 1089 | 781 |
| Расходы и платежи из прибыли | 4 | — |
| Сумма льготы по налогу на прибыль | — | — |
| Прибыль (убыток) к распределению | 1641 | 733 |

Количество акционеров, всего: в том числе юридических лиц – 4, физических лиц – 491.

### ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

| Наименование показателей | Ед. изм. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. руб. | 88 | 197 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 1117 | 2501 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 367,6 | 378,8 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | шт. | — | — |

УНП 100230626.

## ОАО «БЕЛХОЗТОРГ»

### ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 26 МАРТА 2010 г. ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2009 г. и основных направлениях развития ОАО «Белхозторг» на 2010 г.
2. О работе Наблюдательного совета в 2009 г.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белхозторг» за 2009 г.
4. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках за 2009 г.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2009 год и выплате дивидендов за 2009 г.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли, остающейся в распоряжении общества за 2010 г. и 1 кв. 2011 г. Периодичность выплат дивидендов в 2010 г.
7. Избрание нового состава Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Об утверждении дополнений и изменений в Устав Общества.

Место проведения: **г. Минск, ул. Платонова, 34, актовый зал.**

Время регистрации участников собрания: **26 марта 2010 года с 13.00 до 14.45.**

Начало собрания **15.00.**

**Для регистрации при себе иметь:**
- акционеру Общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность. УНП 100230626.


Погляд

# І ЗНОЎ НОВЫ ПАВАРОТ

*Некалькі спрэчных слоў і высноў з нагоды інаўгурацыі чацвёртага прэзідэнта Украіны*

Леанід ЛАХМАНЕНКА

**НЯМА канца шматлікім прагнозам і прадказанням на тэму, якім стане прэзідэнцтва Віктара Януковіча, наколькі кардынальна яно будзе адрозніваецца ад кіравання яго цёзкі Юшчанкі. Думаю, што палітычнага землятрусу не адбудзецца, новы прэзідэнт не пойдзе, як яго папярэднік, не тое што на рашучы разварот, а нават на рэзкі віраж. Бо гэта можа занесці дзяржаўную машыну наўзбочыну. Мы, хутчэй за ўсё, убачым у выкананні Януковіча і яго каманды даволі глыбокі паварот, станем сведкамі рэалізацыі палітыкі «залатой сярэдзіны». У сэнсе адносінаў са знешнім светам, у першую чаргу з Усходам і Захадам. Усход — гэта Расія і яе аднадумцы па Мытным саюзе, стварэнні адзінай эканамічнай прасторы, Захад — Еўрапейскі саюз, ЗША. І кожны з гэтых магутных лагераў будзе імкнуцца (і ўжо імкнецца) узяць пад сваё сяброўскае крыло гэту вялікую і пакуль яшчэ канчаткова не вырашыўшую свой далейшы шлях краіну. Для яе ў кожнага боку ёсць свае смачныя пернікі-прапановы, ад якіх ёй не хацелася б адмаўляцца.**

Таму пасля інаўгурацыі задача новай прэзідэнцкай адміністрацыі не ў тым, як бы не памыліцца з выбарам гэтага самага галоўнага стратэгічнага партнёра, а ў выбары разумнага балансу адносінаў з асноўнымі партнёрамі. Юшчанка пяць гадоў таму зрабіў адназначную стаўку на Захад, і дзе цяпер гэты пясняр еўрапейскіх каштоўнасцяў і заходніх ліберальных падыходаў у эканоміцы? Дарэчы, Захад быў шчыра здзіўлены і расчараваны непрыстойна малым для сучасных еўрапейскіх палітычных лідараў рэйтынгам папулярнасці Юшчанкі ў канцы яго прэзідэнцкага тэрміну — усяго два працэнты! Своеасаблівы рэкорд апошніх дзесяцігоддзяў у Еўропе. Але паглядзіце, у якой яме апынулася пры Юшчанку краіна: трашчыць фінансавая сістэма, разбураная эканоміка, зашкальвае ўзровень карупцыі, а заўтрашні дзень выклікае трывогу ў большасці насельніцтва. Кажуць, што ў гэтым вялікая віна і ўрада на чале з Юліяй Цімашэнкай, у якой на першым месцы былі прэзідэнцкія амбіцыі, а не паўсядзённыя гаспадарчыя клопаты. Так, але ў свядомасці народа прэзідэнт за ўсё ў адказе ў дзяржаве, у тым ліку і за няўдалыя рашэнні чыноўнікаў высокага рангу. Такі наш славянскі менталітэт.

Разам з тым, стратэгічнае супрацоўніцтва з Еўрапейскім саюзам застанецца перспектыўным і вартым, падкрэслю, вялікай увагі знешнепалітычным вектарам Украіны. Тым больш, што ёй была ясна выказана сустрэчная зацікаўленасць. Яшчэ да абвяшчэння канчатковых вынікаў галасавання, даты працэдуры інаўгурацыі, у адрас Януковіча пасыпаліся віншаванні ад заходніх лідараў. Кіраўнік Еўракамісіі (яна выконвае функцыі ўрада ЕС) Жазэ Мануэль Барозу паабяцаў Украіне палітычную, эканамічную, фінансавую і тэхнічную падтрымку ЕС, у тым ліку і па лініі праграмы «Усходняе партнёрства». Першы прэзідэнт ЕС Херман ван Рампей выказаў надзею на хуткае завяршэнне перамоў паміж ЕС і Украінай аб заключэнні новага пагаднення і запрасіў Януковіча ў найбліжэйшы час наведаць з візітам Брусэль. Запрашэнне даслаў Януковічу і прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі, які запэўніў, што палякі будуць і надалей падтрымліваць еўрапейскія і еўраатлантычныя памкненні Украіны, яе намаганні на шляху рэформаў. Думаецца, гэта актыўнасць сведчыць аб тым, што на Захадзе вераць у здольнасць Януковіча забяспечыць стабільнасць у краіне і хочуць мець з ім справу.

Як таксама і ў Расіі. Праўда, у незалежнай Украіне склалася насцярожанае стаўленне да вялікага расійскага брата. Цяжка сказаць дакладна, хто ў гэтым больш вінаваты, хутчэй, абодва бакі. Юшчанка, напрыклад, не бачыў свайго важкага ўнёску ў пагаршэнні адносінаў з Расіяй. Паводле яго слоў, ён толькі па меры магчымасцяў імкнуўся стрымліваць «імперскія амбіцыі Масквы». І, здаецца, моцна перастараўся. Масква ў адказ рабіла часам даволі жорсткія захады. Але цяпер яна паводзіць сябе па-сяброўску, нават па-сваяцку, дарує пэўныя памылкі і агрэхі маладой украінскай дэмакратыі, заплюшчвае вочы на пэўныя парушэнні дамоўленасцяў. І не толькі таму, што для Расіі фігура Януковіча больш прымальная на пасадзе прэзідэнта, чым Цімашэнкі. Відаць, у доўгатэрміновых планах Крамля па адраджэнні былой палітычнай вагі і ўплыву Расіі ў вырашэнні глабальных міжнародных праблем, ператварэнні яе ў эканамічна магутную дзяржаву, а расійскі рубель у цвёрдую рэгіянальную фінансавую валюту, здольную ў будучыні кінуць выклік амерыканскаму долару і еўра, надзейнаму саюзу з Украінай адводзіцца далёка не апошняе месца. Адсюль і паслабленні ў «газавай» дыпламатыі. Напрыклад, украінскі «Нафтагаз» набывае ў «Газпрама» менш «блакітнага» паліва, чым прадугледжана кантрактам. За гэта «Газпрам» мае права накласці немалы штраф, але чамусьці абыходзіцца без санкцый. Іх не выкарыстоўваць, кажуць, папрасіў кіраўніцтва «Газпрама» сам расійскі прэзідэнт.

Думаецца, Януковіч у знак удзячнасці спусціць на тармазах шэраг найбольш спрэчных ініцыятыў і не заўсёды ўзважаных рашэнняў Юшчанкі, якія спрыялі ўзнікненню непаразуменняў і росту напружання ў адносінах з Масквой. У прыватнасці, верне, як і абяцаў, рускую мову ва ўсе сферы жыцця, зніме напружанасць вакол Чарнаморскага флоту, разбярэцца з так званай гераізацыяй Бандэры, не будзе фарсіраваць збліжэнне з ЕС, адмовіцца праз рэферэндум ад уступлення ў НАТА. І паралельна паспрабуе дамовіцца з Расіяй і ЕС аб новых умовах паставак і транзіту газу. Януковіч не хавае, што яму вельмі не падабаецца пракладка газаправодаў у абыход Украіны. На яго думку, пасля здачы ў эксплуатацыю Паўднёвай і Паўночнай труб- струменяў «Украіна стане нікому не патрэбнай». А таму, каб не выйшла так, «што цяпер нас і Расія, і Еўропа выкарыстаюць, а потым мы будзем не патрэбныя», новы прэзідэнт адразу пасля інаўгурацыі пачне перамовы аб гарантыях прапампоўкі гарантаваных аб'ёмаў газу на доўгатэрміновую перспектыву. Такім чынам, газам праверыць словы Масквы будаваць з Украінай трывалыя ўзаемавыгадныя адносіны.

А што сам новы прэзідэнт думае аб мэтах партнёрства Украіны? На гэту тэму ім сказана дастаткова. Мне, напрыклад, спадабалася думка, якую Януковіч неяк выказаў яшчэ задоўга да выбараў. Гэта агульнае меркаванне аб прыярытэтах і вектарах маладой украінскай дзяржавы. На яго погляд, для Украіны, якая з'яўляецца вялікай сям'ёй, галоўны інтарэс у тым, каб «быць заўсёды там, дзе выгадна, дзе лепш, дзе мы больш заробім». Украіне варта зарабляць «і там, і там, і там», — сказаў ён. І дадаў, што яго пазіцыя такая: Украіне трэба быць там, дзе лепей. Сказана проста і зразумела, як і належыць палітыку, які прайшоў праз усе выпрабаванні перадвыбарнай барацьбы. Іншымі словамі, Януковіч прытрымліваецца палітыкі «залатой сярэдзіны».

Будзем мець на ўвазе, што ў Кіеве на пасаду кіраўніка дзяржавы заступае палітык, узбагачаны ўласным жыццёвым досведам, які прайшоў шлях ад газазваршчыка да палітычнага дзеяча, лідара буйной партыі, пераможцы ў надзвычай цяжкай прэзідэнцкай гонцы. Далёка не ўсё гладка было ў час гэтага ўзыходжання. Дарэмна ворагі раскручвалі тэму дзвюх яго судзімасцяў. Ён не хаваў гэтыя факты ад народа, у яго біяграфіі ўказваецца, што ў 1967 і 1970 гадах быў незаконна асуджаны. Як і тое, што ў 1978 годзе прэзідыум Данецкага абласнога суда адмяніў абодва прысуды за адсутнасцю складу злачынства. Думаецца, гэтыя непрыемнасці толькі загартавалі характар будучага прэзідэнта. На вяршыню ўлады ён прыйшоў таксама і з вялікім досведам апазіцыйнай барацьбы, і, што, на мой погляд, вельмі важна ў цяперашняй Украіне, з веданнем негатыўнага досведу каманды Юшчанкі. Яго пралікі — выдатная школа вучобы на чужых памылках, своеасаблівы задачнік з правільнымі адказамі ў канцы кнігі.

Інаўгурацыя — зорны час кожнага палітыка. Гэта прыгожая, урачыстая і ўзнёслая цырымонія. Сёння Януковіч дэманструе народу і свету моцны дух і выдатную фізічную форму. Насуперак усім дзеянням і чорнаму піяру нядобразычліўцаў ён дайшоў да фіналу. Заўтра Віктару Фёдаравічу ўжо прыйдзецца дэманстраваць і дзяржаўную мудрасць, і здольнасць вырашаць практычныя заблытаныя і вострыя праблемы, і пастаянна мець на ўвазе, што за яго дзеяннямі ўважліва сочаць і аналізуюць кожны крок не менш таленавітыя палітыкі, якія ўжо спакваля рыхтуюцца да будучых прэзідэнцкіх выбараў.


## ОАО «МИНСКИЙ ПРИБОРОСТРОИТЕЛЬНЫЙ ЗАВОД»

### ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ

(объявление о первом аукционе в газете «Звязда» от 16.12.2009 г.):

**Лот 1.** Токарно-винторезный станок, 1963 г.в. Начальная цена 1 302 000 руб. с НДС.

**Лот 2.** Горизонтально-расточной станок, 1967 г.в. Начальная цена 8 965 000 бел. руб. с НДС.

**Лот 3.** Продольно-строгальный станок, 1966 г.в. Начальная цена 11 200 000 бел. руб. с НДС.

**Лот 4.** Фрезерный станок 6520 Ф3, 1978 г.в. Начальная цена 10 615 000 бел. руб. с НДС.

**Место расположения предметов аукциона: г. Минск, пр. Независимости, 58.**

Задаток в размере 5 % от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840. Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

Всю необходимую информацию, а также условия проведения аукциона можно получить по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Контактный телефон 8(017) 293 94 33. Факс 293 94 40.

Аукцион состоится **4 марта 2010 г. в 13.00** по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 3 марта 2010 г. до 16.00.** УНП 100363840.

Утерянные страховые полисы ЗСАО «БелИнгострах» добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии ИС №№ 0345432, 0347912, 0347913, 0347914, 0358364, 0358366, 0358367, 0358368, 0358369, 0358370, 0362733, 0365328 считать недействительными.

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

### по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона** | **Незавершенное законсервированное капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка** |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Брестская область, г. Иваново, ул. Карла Маркса, 117 |
| **Продавец недвижимого имущества** | ГУ «Брестская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений», тел. (0162) 45 22 75 |
| **Сведения о предмете аукциона** | Незавершенное строительством здание одноэтажное, кирпичное, площадь – 233,6 кв.м, готовность – 72 %, в т.ч. фундамент, стены и перегородки, перекрытие, кровля, полы – 100 %. Земельный участок площадью 0,0744 га использовать для размещения объектов по оказанию услуг, промышленности, общественного питания, торговли; срок аренды – 30 лет |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 87 081 354 |
| **Сумма задатка, руб.** | 8 708 000 |
| **Организатор аукциона** | ***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by*** |

Аукцион состоится **30 марта 2010 года в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – по 29 марта 2010 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 29 марта 2010 года включительно.***

## ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 35»

### сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 31 марта 2010 года в актовом зале здания, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 38.

Регистрация участников с 14.30 до 15.00.
Начало собрания — 15.30.

**ПОВЕСТКА СОБРАНИЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 г. и основных направлениях деятельности Общества на 2010 г.
2. О работе Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии в 2009 г.
3. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2009 г.
4. Утверждение распределения чистой прибыли и дивидендов по результатам деятельности Общества за 2009 г.
5. Утверждение порядка распределения прибыли в 2010 г. и I квартале 2011 г.
6. Утверждение регламента работы Общества с реестром владельцев ценных бумаг.
7. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
8. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Определение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. О предоставлении Наблюдательному совету права принятия решения по отдельным вопросам, не отнесенным уставом Общества к исключительной компетенции общего собрания.
11. О внесении дополнений в Устав Общества.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

**Справки по телефонам (8 017) 331 41 89, 280 52 76.** УНП 100289278


## Справаздача Міжнароднага дабрачыннага фонду «Праект дапамогі дзецям Чарнобыля» аб скарыстанні сваёй маёмасці за 2009 год

1. Колькасць заснавальнікаў фонду — 8.
2. Маёмасць (дамы, набытыя з мэтай заснавання дзіцячых дамоў сямейнага тыпу) — 363 205 000 беларускіх рублёў.
3. Грашовыя сродкі, паступіўшыя ад заснавальніка, у якасці замежнай дабрачыннай дапамогі — 198 913 еўра, 45 000 долараў.
4. Грашовыя сродкі, паступіўшыя ад грамадзян Рэспублікі Беларусь, — 355 000 беларускіх рублёў.
5. Агульная сума расходаў, панесеных фондам на дасягненне грамадска карысных мэтаў, адпавядаючых статуту — 721 872 818 беларускіх рублёў.
6. Прадпрымальніцкая дзейнасць фондам не вялася. УНП 805001004.


## ОАО «МИНСКТОРГАВТОТРАНС»

извещает своих акционеров о проведении **30 марта 2010 г.** очередного общего собрания акционеров, которое состоится по адресу: г. Минск, пер. Солтыса, 5, Грузовой автомобильный парк № 3 ОАО «Минскторгавтотранс» (актовый зал).

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и о задачах на 2010 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2009 году.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибыли и убытках за 2009 год.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли, полученной в 2009 году и на 2010 год.
6. О преимущественном праве акционерного общества на приобретение собственных акций и передаче Наблюдательному совету полномочий, отнесенных к компетенции общего собрания.
7. Утверждение Регламента работы с реестром владельцев ценных бумаг.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Начало собрания **в 16.00.** Регистрация участников **с 15.00 до 15.50** по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: **акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

С материалами по вопросам повестки дня можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. П. Бровки, 30, в рабочие дни с 9.00 до 16.30, начиная с 18 по 29 марта 2010 г., либо 30 марта 2010 г. по месту проведения собрания.** УНН 100217272

## ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ»

извещает, что отчетно-выборное собрание акционеров состоится **30 марта 2010 года** по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 4. Начало собрания в 13.00. Регистрация акционеров с 12.00. При себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

**Повестка дня:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и основные направления деятельности в 2010 году.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2009 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2009 год. Утверждение дивидендов и сроки их выплаты.
6. О направлениях использования чистой прибыли на 2010 год и первый квартал 2011 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2010 году.
7. Об оказании спонсорской помощи в 2010 году.
8. Утверждение размеров вознаграждений членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт».

УНП 600013173 **Тел. 224 19 17.**


## ОТЧЕТ

### Международного фонда развития сельских территорий об использовании своего имущества за 2009 год

Количество учредителей Международного фонда развития сельских территорий — 9, из них 8 — физические лица.

Информация о стоимости имущества Международного фонда развития сельских территорий (далее — Фонд):

- стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет 43 650 000 белорусских рублей;
- поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с уставом Фонда, составляют 205 594 973 белорусских рубля;
- поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, — 4 598 700 белорусских рублей;
- доходов от предпринимательской деятельности, осуществляемой Фондом, — 9 881 320 белорусских рублей.

Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе Фонда, составила 195 746 898 белорусских рублей.

Фонд является участником потребительского кооператива «Республиканский микрофинансовый центр», решение правления, Протокол Правления фонда № 5 от 23 июля 2009 г.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях. УНП 805000817.


## РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

- **оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вреда от залития, пожара и др.)**
- **организация и проведение аукционов**

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»

- здание административно-хозяйственное, инв. № 200/С-42497, пл. 589,0 кв.м, по адресу: Витебск, ул. 4-я Заслонова, 4А, начальная цена продажи с учетом НДС 269 193 355 руб., для обслуживания здания выделен зем. участок пл. 0,0668 га.

**Характеристика объекта в соответствии с техпаспортом:** фунд. бетонный; наруж. и внутр. капстены кирпич; перегородки кирпич; перекрытия чердачные, междуэтажные – ж/б плиты; крыша рулонная; полы паркетные, бетонные, плитка; проемы оконные, дверные – простой работы; внутр. отделка – окраска, оклейка обоями; центральное отопление – чугунные радиаторы; водопровод – стальные трубы; электроосвещение – скрытая проводка; вентиляция в кап. стенах; канализация – чугунные трубы.

1. Аукцион состоится **30 марта 2010 в 12.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по 29.03.2010 (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников 30.03.2010 с 11.30 до 12.00 по месту проведения аукциона.

2. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением, разработанным в РУП «Витебский институт недвижимости и оценки». Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

3. Для участия в аукционе приглашаются юр.лица и физ.лица, подавшие в установленном порядке заявление с приложением следующих документов: заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % стоимости лота; юр. лицом РБ или индивидуальным предпринимателем – копии учредительных документов и свидетельства о госрегистрации; иностранным юр. лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка д/быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юр.лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр.лица – документ, подтверждающий его полномочия.

4. Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» Витебска, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

5. Победитель возмещает затраты по организации и проведению аукциона, которые сообщаются участникам до начала проведения аукциона и подлежат уплате в течение 20 рабочих дней после проведения аукциона.

6. Победитель аукциона обязан заключить договор купли-продажи с Продавцом, не позднее 20 рабочих дней после проведения аукциона. Платежи за объект осуществляются согласно договору купли-продажи.

**Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02; www.Ocenka.by.**

